# Гісторыя стварэння сельсаветаў

## Мірскі сельсавет

Паселішча Мір упершыню ўпамінаецца ў 1395 годзе, калі крыжакі на чале з Конрадам фон Юнгінгенам зруйнавалі паселішча. Пасля, як паселішча было адбудавана, вялікі князь Вітаўт перадаў двор Мір свайму брату князю Жыгімонту Кейстутавічу, які ў 1434 годзе падараваў паселішча літоўскаму князю Пятру Сеньку Гедыгольдавічу. З 1486 года паселішча Мір знаходзілася ва ўладанні Ільінічаў. Уласны двор Ільінічаў быў абнесены земляныміваламі, а паселішча мела чатыры брамы па асноўных вуліцах Замкавая, Віленская, Мінская і Слонімская. У 1520-х гадах Юрый Ільініч заклаў Мірскі замак і аб гэтым упамінаецца ўпершыню ў 1527 годзе. У 1553 годзе паселішча Мір цэнтр Мірскага графства атрымала статус пасёлка. З 1565 па 1566 год пасёлак Мір у Вялікім Княстве Літоўскім у складзе Навагародскага (Наваградскага) ваяводства і Навагародскага (Наваградскага) павета. У 1568 годзе ад Юрыя Ільініча малодшага пасёлак Мір перайшоў да М. К. Радзівіла (Сіроткі).

На 27.12.1579 года пасёлку Мір нададзена няпоўнае Магдэбургскае права і ўведзена права гарадскога кіравання. З 1589 года пасёлак знаходзіцца ў складзе Нясвіжскай ардынацыі як асобнае графства. У канцы XVI і на пачатку XVII стагоддзяў прадаўжаецца будаўніцтва Мірскага замка і быў закладзены італьянскі парк, а ў 1595 годзе была заснавана Траецкая царква і ў 1885 годзе Мікалаёўскі касцёл. У час руска-польскай вайны ў 1655 годзе пасёлак Мір быў часткова разбураны і на канец XVII стагоддзя адбудаваны. У гэты час у пасёлку дзейнічалі чатыры рамесляныя цэхі, якія выраблялі каля пяцідзесяці відаў ткацкіх, шавецкіх і дывановых вырабаў. У другой палавіне XVIII стагоддзя ў пасёлку Мір пачалі дзейнічаць палатняныя, суконныя і ткацкія майстэрні.

У выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 годзе пасёлак Мір у складзе Расійскай імперыі цэнтр воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні і статус пасёлка паніжаны да мястэчка. З 1828 года мястэчка

належала Вітгенштэйнам, а з 1891 года ва ўладанні Святаполк-Мірскіх. У 1886 годзе ў мястэчку Мір дзейнічала дзве царквы, сем сінагог, мячэць, павятовае вучылішча, школа, паштовая станцыя, заездны дом і каля васьмідзесяці крамаў, а з 1893 года вінакурны завод. Да 1904 года была пабудавана часоўня-усыпальніца Святаполк-Мірскіх. На канцы XIX стагоддзя ў Міры дзейнічала Мірская іешыва (акадэмія равінаў).

У мястэчку Мір з 29.10.1917 года ўстаноўлена савецкая ўлада, а з 18.12.1918 года Мір акупіраваны кайзераўскай Германіяй. З красавіка 1919 года Мір акупіраваны Польшчай, а ў ліпені 1920 года вызвалены Чырвонай Арміяй і з кастрычніка 1920 года зноў акупіраваны Польшчай. Пасля Рыжскага мірнага дагавора ў 1921 годзе мястэчка Мір у складзе Польшчы цэнтр вясковай гміны Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Навагрудскага ваяводства. Да палавіны 1920-х гадоў у наваколлі Міра польскімі ўладамі праведзена хутарызацыя сялянскіх гаспадарак. У гэты час у мястэчку пачалі дзейнічаць паштовая ўправа, гарадскі суд, сямікласная школа.

У 1923 годзе гміна вясковая Мір у складзе: - мястэчка Мір; - вёскі Аюцавічы, Беражна, Вічытарава*, Возерскае, Вялікае Сяло, Дразды*, Залужжа*, Крынічнае, Лужа, Любна, Ператокі*, Пясочная, Радунь, Саванi*, Сімакава, Скамарошкі*, Слабодка*; - фальваркі Аюцавічы, Беражна, Валодзева*, Звярынец*, Мір, Міранка, Пясочная, Ражкова*; - засценкі Бербашы, Віскачы*, Гарачкі, Гарбачы*, Градкі, Залаззе, Збыцін*,Ініца*, Казейкі*, Касцюкі, Міранка Старая, Навагоркі*, Пархімовічы, Прылукі, Рудзішча, Цвіркі*; - асады Гарадзішча*, Прапасны*, Ябланаўшчына, Міранка асада млыновая; - лесніčоўка Берштаны*. [* у цяперашні час тэрыторыя Залужскага (да 12.10.1940 Старасвержанскага) сельсавета, Стаўбцоўскага раёна, Мінскай вобласці].

З 14.11.1939 года мястэчка Мір у складзе Беларускай ССР. У 1940 годзе мястэчку Мір нададзены статус гарадскога пасёлка і з **12.10.1940** года Мір - цэнтр раёна і пассавета Баранавіцкай вобласці. Вёска Аюцавічы - цэнтр

сельсавета Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці ў складзе вёскі: Лемнікі, Радунь. Вёска Прылукі - цэнтр сельсавета Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці ў складзе вёскі: Бережна, Бербашы, Гарачкі, Крынічнае, Лужа, Любна, Міранка. Вёска Сімакава - цэнтр сельсавета Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці ў складзе вёскі: Возерскае, Вялікае Сяло. Вёскі Вялікая Мядзвядка, Засценкі, Малая Мядзвядка, Хлюпічы ў Жухавіцкім сельсавеце, а вёска Студзёнка ў Скорыцкім сельсавеце Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці. З 26.07.1941 года Мірскі пассавет акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, тэрыторыя знаходзіцца ў складзе генеральнай акругі "Беларусь", якая ўваходзіла ў склад рэйхскамісарыята "Остланд". З 07.07 1944 года тэрыторыя пассавета вызвалена ад акупацыі. З 17.11.1945 года створаны Вялікамедзвядскі сельсавет - цэнтр вёска Вялікая Медзвядка Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці ў складзе вёскі: Засценкі, Малая Мязвядка, Хлюпічы.

З 08.01.1954 года тэрыторыі пассавета і сельсаветаў уваходзяць у склад Гродзенскай вобласці. Да Аюцавічскага сельсавета з 16.07.1954 года далучаны Сімакаўскі сельсавет, а Медзвядскі сельсавет далучаны да Жухавіцкага сельсавета.

З 17.12.1956 года, пры ўзбуйненні раёнаў, Мірскі раён аб'яднаны з Карэліцкім раёнам Гродзенскай вобласці. З 02.12.1961 года да Мірскага пассавета далучаны Прылукскі сельсавет, вёскі Бережна, Бербашы, Гарачкі, Крынічнае, Прылукі, Лужа, Любна і вёска Студзёнка са Скорыцкага сельсавета. З 25.12.1962 года Карэліцкі раён далучаны да Навагрудскага і тэрыторыі пассавета і сельсаветаў, у складзе Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, а з 06.01.1965 года тэрыторыі пассавета і сельсаветаў зноў у складзе Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. З 30.01.1967 года да Мірскага пассавета далучана вёска Вялікае Сяло, з 06.04.1977 года далучаны Сімакаўскі сельсавет, вёскі Аюцавічы, Возерскае, Сімакава, і з 23.07.1979 далучаны вёскі Вялікая Мядзвядка, Засценкі, Малая Мядзвядка, Хлюпічы з Жухавіцкага сельсавета. Старшыні пассавета: Ламан К.А., Нос А.П., Файчук

І.С., Бычкоў А.Ф., Паўловіч Ф.М., Касцюк Г.Ф., Грамыка І.Я., Табакоў Ул.В., Пыко Н.П., Гардзей Р.Р., Масюк Д.М., Кныш Г.І., Кадлубай Ул.А., Саладуха І.Г., Папова І.Ул., Пятрушка І.Ул., Янкоўскі Г.Дз., Янкоўскі А.М.

Згодна рашэння Карэліцкага раённага Савета дэпутатаў ад 24.12.2008 года № 92 г.п. Мір пераўтвораны ў аграгарадок Мір.

Мірскі пассавет перайменаваны ў сельсавет з 20.02.2014 года ў складзе: аграгарадок Мір, аграгарадок Аюцавічы, вёскі Беражна, Бербашы, Возерскае, Вялікая Мядзвядка, Вялікае Сяло, Гарачкі, Засценкі, Крынічнае, Лужа, Любна, Малая Мядзвядка, Міранка, Прылукі, Сімакава, Студзёнка, Хлюпічы. Старшыні сельсавета: Янкоўскі А.М., Квач В.І.

За час станаўлення сельсавета былі створаны прамысловыя і сельскагаспадарчыя адзінкі, якія адыгралі значымую роль у развіцці інфраструктуры цяперашняй тэрыторыі. Так у 1895 годзе ўведзены ў эксплуатацыю Мірскі спіртавы завод. У канцы 1940 года праведзена рэканструкцыя і завод знаходзіцца ў рэспубліканскім падпарадкаванні. У цяперашні час Мірскі філіял РУП “Гродзенскі лікёра-гарэлачны завод”. Дырэктары завода Навіцкі М. Ул., Хоміч І. А., Янкоўскі Г. Дз., Будзейка І. В. У маі 1940 года была арганізавана Мірская МТС, якая ў 1954 годзе был рэарганізавана, а тэхніка размеркавана па калгасам. З 20.07.1944 адкрылася Мірская раённая бальніца. Першы лекар Гохман І.К., затым галоўныя ўрачы Пазняк З.М., Кшывіцкі С.А., Брант Ж.С. Са жніўня 1944 года пачаў працаваць прамкамбінат у падпарадкаванні якога былі электрастанцыі ў Міры і Турцы, два лесазаводы, цагляны завод, маторныя і вадзяныя млыны і майстэрні па вырабу мэблі і пашыву адзення. У 1947 годзе арганізавана торфапрадпрыемства “Міранка” ва ўрочышчы “Воўчае балота”. У 1987 годзе торфапрадпрыемства было далучана да торфабрыкетнага завода “40 гадоў БССР” Лідскага раёна. У сярэдзіне 80-х філіял торфазавода практычна перастаў існаваць.

У верасні 1988 года пачало дзейнічаць Мірскае дзяржаўнае мастацкае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 234, з 1990 года мастацкае прафесійна-

тэхнічнае вучылішча будаўніча-рэстаўрацыйных работ і ў цяперашні час УА “Мірскі дзяржаўны мастацкі прафесійна-тэхнічны каледж”. Дырэктары: Вахтомаў Г.В., Кадлубай Ул.А., Кадлубай Н.Л.

У 1961 годзе на базе міжкалгаснага завода кармавых антыбіётыкаў створана Мірская міжкалгасная птушкаферма, якая ў 1966 годзе рэарганізавана ў саўгас “Чырвонаармейскі”. У 1971 годзе саўгас пераўтвораны ў птушкафабрыку “Чырвонаармейская” ў г.п. Мір. Дырэктары: Груша В.П., Корж М.І., Груша А.П., Курчыцкі В.В., Марзан М.П., Каралёва В.Ф., Калодка А.А., Пятрушка І.Ул. Затым птушкафабрыка “Чырвонаармейская” была аб`яднана з саўгасам “Мірскі”.

У 2000 годзе закончана рэканструкцыя Мірскага замка, які ўключаны ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА.

*Як утваралася камунальнае сельскагаспадарчае вытворчае прадпрыемства “Птушкафабрыка “Чырвонаармейская”.*

*Утварэнне саўгаса “Мірскі”.* З 27.08.1948 года адноўлены калгас “Першае Мая”, вёска Сімакава (у 1939 г. канчаткова не арганізаваны), а з 21.07.1949 г. - калгас “Камунар”, вёска Вялікае сяло (у 1940 г. канчаткова не арганізаваны) і з 27.09.1949 г. - калгас “Новае жыццё”, вёска Возерскае (у 1940 г. канчаткова не арганізаваны). Калгасы “Камунар”, вёска Вялікае Сяло і “Новае жыццё”, вёска Возерскае аб`яднаны 03.11.1950 г. з калгасам “Першае Мая”, вёска Сімакава. На 15.03.1964 года на базе прыёмна – адкормачнага пункта арганізаваны саўгас “Мірскі” - цэнтр гарадсі пасёлак Мір, а з 01.01.1966 года да саўгаса “Мірскі” далучаны калгас “Першае Мая”. Дырэктары: Шакуля В.Я., Грыцкевіч Ул. Ул., Ханько Дз. Дз. Яфімчык І. І., Пышко А. Ул., Есьман Г. І., Палуян І. І., Пятрушка І. Ул.

Затым саўгас “Мірскі” быў аб`яднаны з птушкафабрыкай “Чырвонаармейскай” ” і арганізавана камунальнае сельскагаспадарчае вытворчае прадпрыемства “Птушкафабрыка “Чырвонаармейская” - цэнтр гарадскі пасёлак Мір, а з 2012 года, пасля далучэння да СПК “Аюцавічы-Агро” - цэнтр камунальнага сельскагаспадарчага вытворчага прадпрыемства

перанесены ў аграгарадок Аюцавічы. Дырэктары: Лаўровіч І. М., Янкоўскі А.М., Марзан М.П.

*Утварэнне калгаса "Нёман".* З 25.08.1948 года арганізаваны калгас імя Ракасоўскага, вёска Бербашы, з 20.11.1949 года - калгас імя Пятра Купрыянава, вёска Любна, з 18.02.1950 - калгас "Нёман", вёскі Беражна і Крынічнае. З 03.03.1950 года арганізаваны калгас імя Васілеўскага, вёскі Прылукі, Гарачкі і Студзёнка, з 24.07.1950 года - калгас "Чырвоны Бор", вёска Лужа. З 03.01.1951 года калгас імя Васілеўскага перайменаваны ў калгас "Дружба", вёска Прылукі і да яго далучаны калгасы імя Ракасоўскага, імя Пятра Купрыянава і "Чырвоны Бор", а з красавіка 1956 года калгас "Неман". У студзені 1963 года калгас "Дружба", вёска Прылукі перайменаваны ў калгас "Нёман" і цэнтр перанесены ў вёску Любна. Старшыні: Скудро В.П., Бусько П. Б., Ханько Дз. Дз., Кемш І. Б. З 01.07.1988 года калгас "Неман" далучаны да саўгаса "Мірскі" - цэнтр гарадскі пасёлак Мір.

*Утварэнне калгаса "Савецкая Беларусь".* З 18.07.1948 арганізаваны калгас імя Леніна, вёска Аюцавічы, з 24.01.1950 - калгас "Праца", вёскі Вялікая Мядзвядка і Малая Мядзвядка, з 04.03.1950 - калгас імя Шверніка, вёскі Хлюпічы і Лемнікі. Калгасы "Праца" і імя Шверніка 07.09.1951 года аб`яднаны з калгасам "Праца" і перайменаваны ў калгас "Сцяг працы", вёска Вялікая Мядзвядка. З 30.05.1978 года да калгаса імя Леніна, вёска Аюцавічы далучаны калгас "Сцяг працы" і перайменаваны ў калгас "Савецкая Беларусь", вёска Аюцавічы. Старшыні калгаса: Супрон Г.А., Манько І.В., Мяць Б.С., Лупсякоў П. Р, Лаўровіч І. М. З 2002 года калгас "Савецкая Беларусь" пераўтвораны ў фермерскую гаспадарку "Аюцавічы", а з 2006 года ў СПК "Аюцавічы-Агра". Згодна рашэння Карэліцкага раённага Савета дэпутатаў ад 24.12.2008 г. № 92 вёска Аюцавічы пераўтворана ў аграгарадок Аюцавічы. На пачатку 2012 года СПК "Аюцавічы-Агра" далучаны да камунальнага сельскагаспадарчага вытворчага прадпрыемства "Птушкафабрыка "Чырвонаармейская".

Знакамітыя землякі: г.п. Мір - філосафы Фларыян Бохавіца і Саламон Майман, беларускія акцёры Ільінскі А.К. і Ільінскі М.К., беларускія пісьменнікі Тармола-Мірскі Р.Я. і Іпатава В.М., вёска Беражна - пісьменнік Крамко Я.І. , вёска Бербашы - беларускі літаратуразнаўца Андраюк С.А., вёска Вялікая Мядзвядка - вучоны Ігнацій Дамейка, гісторык, журналіст Аляксандр Богуш, чэмпіёнка свету Еўропы, СССР па вяславанню на байдарках Шыманская Т.М.

**Жухавіцкі сельсавет**

Сяло і маёнтак Вялікія Жухавічы ўпершыню ўпамінаецца ў дакументах у сярэдзіне XV стагоддзя. У 1449 годзе Мікалай Няміровіч атрымаў ад вялікага князя літоўскага Казіміра маёнтак Жухавічы. Потым маёнтак Жухавічы належаў А. І. Хадкевічу, пры Жыгамонце перайшоў ва ўласнасць Ільінічаў. З 1568 года сяло і маёнтак Жухавічы перайшлі ва ўласнасць Радзівілаў. У 1745 годзе пабудавана прыходская Петрапаўлаўская царква. У 1777 годзе фальварак Жухавічы складалі двор Жухавічы, сёлы Вялікія Жухавічы і Кожава. З 1799 года ў складзе фальварка двор Жухавічы і сяло Вялікія Жухавічы. У канцы XIX і на пачатку XX стагоддзя вёска Вялікія Жухавічы цэнтр воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. З 1858 года вёска адносілася да маёнтка Жухавічы, належыць князю П. Вітгенштэйну. У 1863 годзе адкрыта царкоўна-прыходская школа, потым перайменавана ў народнае вучылішча. З 1897 года ў вёсцы Вялікія Жухавічы знаходзіцца ўправа, хлебазапасны магазін, карчма.

Сяло Малыя Жухавічы ўпершыню ўпамінаецца ў дакументах у канцы XV стагоддзя. Тут ствaралася Малажухавіцкае Евангелле - помнік старабеларускага рукапіснага кнігапісання. Сяло Малыя Жухавічы Навагрудскага павета у 1683 годзе належала смаленскаму стольніку Карлінскаму. У 1783 годзе пабудавана драўляная царква Іаана Прадцечы. Пры царкве дзейнічала царкоўна-прыходская школа. У канцы XIX і на пачатку XX стагоддзя вёска Малыя Жухавічы ў Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1864 годзе пабудавана новая царк-

ва. У 1880 годзе адкрыта школа пісьменнасці, потым ператворана ў царкоўна-прыходскую.

У 1921-1939 гадах вёскі Вялікія Жухавічы і Малыя Жухавічы ў Жухавіцкай вясковай гміне Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Навагрудскага ваяводства Польшчы. Гміна вясковая Жухавічы ў складзе: - вёскі Бурдзевічы, Вышкава, Вялікія Жухавічы, Далматаўшчына, Кожава, Крынкі, Крышылоўшчына, Лукі, Малыя Жухавічы, Некрашэвічы, Трашчычы, Унехава, Церабостынь; - фальваркі Адамава, Бурдзевічы, Вялікія Жухавічы, Далматаўшчына 2 фальваркі, Крынкі, Крышылоўшчына, Малыя Жухавічы 2 фальваркі, Унехава, Уша, Цетра; - засценкі Бярасцянка, Душчыцы, Ксяндзоўшчына, Саматыя, Свяцілкі, Хамічы, Шкоды; - асады Булгакаўшчына, Некрашава.

Вёска Малыя Жухавічы з’яўляліся адміністрацыйным цэнтрам гміны. Тут размяшчалася гмінная ўправа і паліцэйскі ўчастак. У верасні 1921 года працавала польская пачатковая школа ў канцы 20-х гадоў закрыта. На землях былога маёнтка пасяліліся каланісты-асаднікі, якім улады перадалі прымусова адабраную ў сялян сервітутную пашу і правялі хутарызацыю сялянскіх гаспадарак. У гэты час у Вялікіх Жухавічах працаваў млын, прыватны і кааператыўны магазін, прадуктовая лаўка, кааператыўная ашчадна-крэдытная каса (каса Стэфчыка), паштовае аддзяленне (з 1931 года паштовае агенцтва). У асадзе Жухавічы працавала сыраварня, існавала польская шасцікласная, агульнаадукацыйная школа другой ступені. Пры школе мелася хата-чытальня. З 1927 года ў Жухавічах працаваў кружок таварыства беларускай школы (старшыня А.І. Грушэўскі).

З **12.10.1940** вёска Вялікія Жухавічы цэнтр сельсавета Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці ў складзе вёскі: Бурдзевічы, Малыя Жухавічы, Негнічы, Юравічы. Вёска Уша цэнтр сельсавета Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці ў складзе вёскі: Кожава, Трашчычы, Церабостынь. Вёскі Лемнікі, Радунь уваходзілі ў Аюцавіцкі сельсавет Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці. Вёска Пясочная уваходзіла ў Прылуцкі сельсавет Мірскага раёна

Баранавіцкай вобласці. У канцы 1944 года пачала функцыянаваць участковая бальніца ў вёсцы Жухавічы, у цяперашні час амбулаторыя ўрача агульнай практыкі. У пачатку 50-х гг. на рацэ Уша была пабудавана электрастанцыя. З 16.07.1954 года да Жухавіцкага сельсавета далучаны Мядзвядскі сельсавет, вескі Вялікая Мядзвядка, Засценкі, Малая Мязвядка, Хлюпічы. З 17.12.1956 года тэрыторыя сельсаветаў у складзе Карэліцкага раёна Баранавіцкай вобласці, а з 08.01.1954 у складзе Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. На 16.07.1954 года да Ушанскага сельсавета далучаны вёскі Лемнікі, Пясочная, Радунь. З 25.12.1962 тэрыторыя сельсаветаў у складзе Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, а з 06.01.1965 тэрыторыя сельсаветаў зноў у складзе Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

24.04.1968 года вёскі Вялікія і Малыя Жухавічы аб'яднаны. З 23.07.1979 года да Жухавіцкага сельсавета далучаны Ушанскі сельсавет, вёскі Кожава, Лемнікі, Пясочная, Радунь, Трашчычы, Цerабостынь, а вёскі Вялікая Мядзвядка, Засценкі, Малая Мядзвядка, Хлюпічы перададзены Мірскаму пассавету.

Старшыні сельсавета: Герасімчык П.І., Мамончык А.Ул., Варава С.І., Стульская Н.І.. Налецька В.З., Трушынскі К.М., Казлоў Ф.Н., Кныш І.К., Шыманскі Г.Ф., Хіневіч Л.Ф., Алешкевіч А.І., Худякоў В.М., Бурец М.К., Івашка А.Ул. З 28.12.2010 вёска Жухавічы пераўтворана ў аграгарадок Жухавічы.

*Як утвараўся СВК "Жухавічы"*

Утварарэнне калгаса "Перамога". З 12.03.1946 года арганізаваны калгас "Перамога", вёска Малыя Жухавічы, старшыня Куневіч М.М. (1946-1951гг.), з 12.03.1948 года калгас "Шлях да камунізму", вёска Вялікія Жухавічы, з 20.08.1948 года калгас "Новае жыццё", вёска Юравічы, з 25.08.1948 года калгас "Рассвет", вёска Негнічы, з 28.07.1949 калгас імя Будзёнага, вёска Бурдзевічы. На 12.02.1951 года калгасы "Шлях да камунізму", "Новае жыццё", "Рассвет" імя Будзёнага, далучаны да калгаса "Перамога", вёска Малыя Жухавічы, старшыня Куневіч М.М. (1951-1979гг.).

*Утварэнне калгаса імя Жалезняковіча.* З 21.08.1948 года арганізаваны калгас "17 верасня", вёска Радунь, з 28.07.1949 года калгас імя Кірава, вёска Кожава. На 08.10.1949 года да калгаса імя Кірава далучана вёска Уша, у якую перанесены цэнтр калгаса. З 18.08.1949 года арганізаваны калгас імя Калініна вёска Пясочная, з 07.10 1949 года калгас "Чырвоны сцяг", вёска Церабостынь, з 08.10.1949 года калгас імя Якуба Коласа вёска Трашчычы. На 23.06.1951 года да калгаса імя Кірава, вёска Уша далучаны калгас імя Калініна, а з 23.08.1952 далучаны калгас "17 верасня". На 10.01.1963 года калгас Кірава, вёска Уша перайменаваны ў калгас "Расія". З 28.05.1972 года калгас "Расія", калгасы імя Якуба Коласа, "Чырвоны сцяг" аб`яднаны ў калгас імя Жалезняковіча - цэнтр вёска Вялікія Жухавічы. З 12.03.1979 года да калгаса імя Жалезняковіча далучаны калгас "Перамога", вёска Малыя Жухавічы, старшыні калгаса: Куневіч М. М. (1979-1961), Сакалоў М.Ц., Багушэвіч А.А., Лагуцік Ул. І., Мяць Б. С., Янкоўскі Дз.Дз. У 2006 годзе калгас імя Жалезняковіча перайменаваны ў СВК "Жухавічы".

Знакамітыя землякі: вёска Вялікія Жухавічы - беларускі паэт Варава У.А., беларускі вучоны Марцінеўскі І.Л., Герой Сацыялістычнай працы Юшко Я.І., вёска Малыя Жухаічы - генерал-палкоўнік Камера І.П., вёска Церабостань - беларускі вучоны Булдык Г.М.

**Красненскі сельсавет**

У канцы XVII стагоддзя сяло Краснае ўваходзіла ў маёнтак Карэлічы, які належаў князям Радзівілам і ўпамінаецца ўпершыню. У 1699 годзе ў сяле пабудавана капліца, у 1777 годзе - карчма. З канца XIX і на пачатку XX стагоддзя вёска Краснае ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. З 1884 года ў вёсцы працуе школа пісьменнасці. У час першай сусветнай вайны вёска было разбурана, а пасля адбудавання з 1921 года па 1939 год знаходзіцца ў Карэліцкай вясковай гміне Навагрудскага павета і ваяводства. З верасня 1921 года польскімі ўладамі праведзена хутарызацыя сялянскіх гаспадарак, на гэты час у вёсцы дзейнічала падпольная ячэйка КСМЗБ, адкрыта польская пачатковая школа.

З 12.10.1940 года вёска Краснае ў Запольскім сельсавеце Валеўскага раёна Баранавіцкай вобласці. Вёска Заполле - цэнтр сельсавета Валеўскага раёна Баранавіцкай вобласці, ў складзе вёскі Вірышча, Востухава, Жукі, Камаровічы, Краснае, Лясок, Навашыно, Пагор'е (старшыні: Копаць І.А., Арабей М.С., Шэўка З.М., Чужаўка В.В., Федарака А.П., Мялешка М.І.). Вёска Дольная Рута - цэнтр сельсавета Валеўскага раёна Баранавіцкай вобласці, ў складзе вёскі Амневічы, Барацін, Горная Рута, Куцавічы, Паланая, Пятрыкі, Бабнева (старшыні: Вайніла І.К., Лазарэвіч Ул.І., Станкевіч Б.А., Ламан А.А.). Вёскі Бушкі, Загор'е, Кальчычы, Руціца, Стрэльнікі, Тударава ў складзе Карэліцкага сельсавета Валеўскага раёна Баранавіцкай вобласці.

З 25.11.1940 года тэрыторыя сельсаветаў у складзе Карэліцкага раёна Баранавіцкай вобласці, а з 08.01.1954 года тэрыторыя сельсаветаў у складзе Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. 16.07.1954 года ў сувязі з укрупненнем да Дольнаруцкага сельсавета дабаўлены вёскі з Карэліцкага сельсавета і арганізаваны Паланаеўскі сельсавет, ў складзе вёскі Амневічы, Барацін, Бушкі, Дольная Рута, Горная Рута, Загор'е, Кальчычы, Куцавічы, Паланая, Пятрыкі, Руціца, Бабнева, Стрэльнікі, Тударава (старшыні: Дрозд М.І., Шах Ул.М., Лапата Ул.М., Нагорная Л.І., Барышнікаў А.Дз., Кунашка В.К.).

З 25.12.1962 года ў сувязі з аб`яднаннем раёнаў тэрыторыя сельсаветаў у складзе Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, а з 06.01.1965 года тэрыторыя сельсаветаў зноў у складзе Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

З **16.03.1987** года ў сувязі з аб'яднаннем Запольскага і Паланаеўскага сельсаветаў, пасля ўкрупнення, арганізаваны Красненскі сельсавет, вёска Краснае - цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці, ў складзе вёскі Амневічы, Барацін, Бушкі, Вірышча, Востухава, Горная Рута, Дольная Рута, Жукі, Загор'е, Заполле, Кальчычы, Камаровічы, Куцавічы, Лясок, Навашыно, Пагор'е, Паланая, Пятрыкі, Руціца, Садовая (да 30.06.1964

в.Бабнева), Стрэльнікі, Тударава. Старшыні сельсавета Кунашка В. К., Лейко Т. М.

Згодна з рашэннем Гродзенскага аблсавета ад 28.12.2007г. № 56 да Красненскага сельсавета далучана вёска Працяневічы. З 28.12.2010 вёска Краснае пераўтворана ў аграгарадок Краснае Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

*Як утвараўся СВК “Маяк-Заполле”*

Утварэнне калгаса “Новае жыццё”. З 31.12.1948 года адноўлены (у 1941 г. канчаткова не арганізаваны) калгас імя Будзённага, вёска Заполле, старшыня Лейка І.Я. З 29.08.1949 года арганізаваны калгас імя Шверніка, вёска Жукі, старшыня Ложачнік А.В., з 15.09.1949 года калгас “Парыжская камуна”, вёскі Камаровічы і Пагор’е, старшыня Строк М.Л., з 17.11.1949 года калгас імя Малянкова, вёскі Вірышча і Навашыно, старшыня Каляда Т.П., з 24.11.1949 года калгас “Ленінская праўда”, вёска Лясок, старшыня Быліч Ф.Я., з 09.12.1949 года калгас “Новае жыццё”, вёска Востухава, старшыня Малый П.П. З 18.02.1950 года арганізаваны калгас “Чырвоны Сцяг”, вёска Краснае, старшыня Быліч І.П. 03.09.1950 года калгасы імя Будзённага, імя Шверніка, “Парыжская камуна”, імя Малянкова, “Ленінская праўда”, “Новае жыццё”, “Чырвоны Сцяг” аб`яднаны ў адзіны калгас “Новае жыццё”, з цэнтрам у вёсцы Краснае. Старшыні: Капытко Ул.Ф., Рудзеў С.В., Вярбіцкі А.В., Уласевіч М.А., Лычкоўскі С.В.

*Утварэнне калгаса “Вялікі Кастрычнік”.*

З 28.03.1947 года адноўлены калгас імя Молатава, вёска Кальчычы (у 1940 г. канчаткова не арганізаваны), старшыня Турок І.А. З 06.08.1949 года арганізаваны калгас “17 вервсня”, вёскі Загор’е і Мянючычы, старшыня Масловіч С.І., з 12.08.1949 года калгас “Полымя рэвалюцыі”, вёскі Стрэльнікі і Бушкі, старшыня Карчык Ул.Г., з 17.09.1949 года калгас “Сцяг Перамогі”, вёска Руціца, старшыня Піцюль К.К., з 06.11.1949 года калгас “Барацьбіт за мір”, вёска Тударава, старшыня Казляк Ул.І. 20.01.1951 года калгасы імя Молатава, “17 вервсня”, “Полымя рэвалюцыі”, “Сцяг Перамогі”, “Барацьбіт

за мір” аб`яднаны ў калгас імя Молатава, з цэнтрам у вёсцы Кальчычы (старшыні: Сярогін К.С., Лагута М.М.) З 16.07.1957 года калгас імя Молатава перайменаваны ў калгас “Вялікі Кастрычнік” і цэнтр перанесены ў вёску Тударава, старшыня Сярогін К.С. З 16.01.1963 года калгас “Вялікі Кастрычнік” далучаны да калгаса “Маяк”, вёска Горная Рута.

*Утварэнне калгаса імя Чапаева.*

З 29.01.1940 года арганізаваны калгас “30 гадоў БССР”, вёска Паланая, старшыня Вадап’ян М.М., з 23.10.1948 года арганізаваны калгас “30 гадоў ВЛКСМ”, вёска Барацін, старшыня Хвасько І.Ц., з 30.12.1948 года калгас імя Чапаева, вёска Дольная Рута, старшыня Лапата І.М., з 13.01.1949 года калгас імя Жданава, вёска Горная рута, старшыня Кузьміч А.Л., з 13.04.1949 года калгас імя Свярдлова, вёскі Амневічы і Куцавічы, старшыня Лустач І.І., з 21.08.1949 года калгас “Дружба”, вёска Садовая (да 30.06.1964 в.Бабнева), старшыня Кошур М.С., з 21.09.1949 года калгас “Новае жыццё”, вёска Пятрыкі, старшыня Лапата А.Я. 12.12.1950 года калгасы “30 гадоў БССР”, “30 гадоў ВЛКСМ”, імя Чапаева, імя Жданава, імя Свярдлова, “Дружба”, “Новае жыццё” аб`яднаны ў калгас імя Чапаева, з цэнтрам у вёсцы Дольная Рута. Старшыні: Валахновіч В.М., Лопух Г.А., Шасцель В.Ул., Ляўкевіч Г.К. **25.02.1976** года калгас імя Чапаева пераіменаваны ў калгас “Маяк” - цэнтр вёска Горная Рута (старшыні Сатыга У.М. (1976-1983), Санько М. П.).

З 16.11.1986 года калгасы “Новае жыццё”, вёска Краснае і “Маяк”, вёска Горная Рута аб`яднаны ў адзіны калгас “Маяк”, з цэнтрам у вёсцы Краснае. У 2006 годзе калгас “Маяк” перайменаваны ў СВК “Маяк-Заполле”. Старшыні: Лычкоўскі С. В., Шыш І. М., Маковік В. В.

Знакамітыя землякі: вёска Вірышча - беларускі вучоны Качан А.Дз., Герой Сацпрацы Карачан Е.Д., вёска Горная Рута - Герой Сацыялістычнай працы Арда Т.Р., вёска Заполле - першы намеснік старшыні СМ БССР Еўтух У.Г., генерал-маёр Быліч Р.І., беларускі вучоны Рахманько Я.М., вёска Пагор’е - крытык-літаратуразнаўца Дзяшкевіч Мікола, вёска Паланая - генерал-маёр Трусевіч А.В., беларускі вучоны Вадап’ян П.А.

**Лукскі сельсавет**

Сяло-ўладанне Лукі ўпамінаецца ўпершыню ў пачатку XV стагоддзя пры передачы яго касцёлу ў Навагрудку, што у 1518 годзе падцверджана князем літоўскім Жыгімонтам. З пачатку XVIII стагоддзя сяло Лукі належала князям Радзівілам і адносілася да Мірскага графства. У канцы XIX і на пачатку XX стагоддзя сяло Лукі Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні належала князю П. Вітгенштэйну і адносілася да маёнтка Цетра. У 1897 годзе у сяле былі хлебазапасны магазін і карчма. У 1898 годзе пабудавана царква, а ў 1908 годзе адкрыта народнае вучылішча. Вясной 1919 года у сяле Лукі створана сельскагаспадарчая камуна "Праца" старшыня В.І. Бучацкі. З пачатку 1921 года і амаль да канца 1939 года сяло Лукі ў Жухавіцкай вясковай гміне Нясвіжскага (з 1926 г. Стаўбцоўскага) павета Навагрудскага ваяводства. У гэтыя гады ў сяле была арганізавана пачатковая чатырохкласная школа, пазней ператворана ў шасцікласную агульнаадукацыйную, якая праіснавала нядоўга. У гэты час быў арганізаваны спажывецкі кааператыў і працавала пяць прыватных лавак. У 1920-х гадах польскімі ўладамі праведзена хутарызацыя сялянскіх гаспадарак, на гэты час у сяле дзейнічала падпольная ячэйка КПЗБ.

З 12.10.1940 года вёска Крышылоўшчына - цэнтр сельсавета Мірскага раёна Баранавіцкай (з 08.01.1954 Гродзенскай) вобласці, ў складзе вёскі Вышкава, Далматаўшчына, Лукі, Унехава, а вёска Асташын - цэнтр сельсавета Валеўскага (з 25.11.1940 года Карэліцкага) раёна Баранавіцкай (з 08.01.1954 года Гродзенскай) вобласці, ў складзе вёскі Баяры, Любанічы, Сэрвач. З 16.07.1954 года вёскі Баяры, Асташын, Любанічы, ў складзе Кайшоўскага сельсавета.

На **16.07.1954** года створаны Луцкі сельсавет з аб'яднаных Крышылоўшчынскага і Некрашэвіцкага сельсаветаў, а вёска Лукі - цэнтр сельсавета Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці, ў складзе вёскі Вышкава, Далматаўшчына, Унехава, Крышылоўшчына. З 17.12.1956 года вёска Лукі - цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. У сувязі з другім

укрупнеенем сельсаветаў з 03.09.1958 года Кайшоўскі сельсавет ліквідаваны і вёскі Асташын, Баяры, Любанічы далучаны да Луцкага сельсавета, а вёска Кайшоўка - да Цырынскага.

У сувязі з аб'яднаннем раёнаў з 25.12.1962 года вёска Лукі - цэнтр сельсавета Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, а з 06.01.1965 года вёска Лукі, зноў цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Старшыні сельсавета: Башко А.У., Забенька М.Н., Тананка Г.А., Зантовіч А.А., Грынько В.А., Фурс В.М., Ваўчок Л.І.

З 12.1940 года пачала функцыянаваць бальніца ў весцы Вышкава, з 10.1944 Лукская участковая больніца, а ў цяперашні час бальніца сястрынскага догляду.

З 28.12.2010 года вёска Лукі пераўтворана ў аграгарадок Лукі Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

*Як утвараўся СВК "Лукі-Агро".*

*Утварэнне калгаса імя Дзяржынскага.* З 14.02.1949 года адноўлены калгас імя Леніна, вёска Лукі (у 1940г. канчаткова не арганізаваны), з 27.07.1949 года арганізаваны калгас "За Радзіму", вёска Вышкава, з 29.08.1949 года калгас "Сталінскі шлях", вёска Унехава, з 01.11.1949 года калгас імя Дзяржынскага, вёска Далматаўшчына, з 01.11.1949 года калгас імя Заслонава, вёска Крышылоўшчына. З 21.03.1951 года да калгаса "Сталінскі шлях", вёска Унехава далучаны калгасы "За Радзіму" і імя Дзяржынскага. З 11.11.1961 года калгас "Сталінскі шлях" перайменаваны ў калгас імя Дзяржынскага і цэнтр перанесены ў вёску Далматаўшчына.

*Утварэнне калгаса "Сцяг Леніна".* З 14.08.1948 года адноўлены калгас "Бальшавік", вёска Асташын (у 1940г. канчаткова не арганізаваны), з 08.09.1948 года арганізаваны калгас імя Сталіна, вёска Баяры. З 15.02.1949 года калгасы "Бальшавік" і імя Сталіна аб'яднаны ў калгас імя Сталіна - цэнтр вёска Асташын. З 16.03.1949 года арганізаваны калгас імя Леніна, вёска Любанічы, а з 26.11.1950 года да калгаса імя Леніна далучаны да калгаса імя Сталіна вёска Асташын. З 01.08.1958 года калгас імя Сталіна,

вёска Асташын перайменаваны ў калгас “Сцяг Леніна” старшыня Гарбатоўскі А. А. (1953-1976). З **03.09.1958** года центр калгаса “Сцяг Леніна” перанесены ў вёску Лукі. Старшыні калгаса: Гарбатоўскі А.А., Тур В. Я.

З 04.03.1978 года калгас імя Дзяржынскага вёска Далматаўшчына далучаны да калгаса “Сцяг Леніна”, вёска Лукі, а з 24.01.1994 калгас “Сцяг Леніна” перайменаваны ў калгас “Лукі”, вёска Лукі. З 05.08.2003 калгас “Лукі” перайменаваны ў СВК “Лукі-Агра”. Старшыні: Пахолак М.А., Гавіна М.А.

Знакамітыя землякі: вёска Лукі - герой Сацыялістычнай працы Калоша В.Л., вёска Асташын - этнограф, фальклрыст, майстра мастацкай краязнаўчай фатаграфіі Булгак Я., генерал-палкоўнік Нагорны М.Р., вёска Вышкава - беларускі вучоны Трушынскі З.К., вёска Крышылоўшчына - беларускі народны казачнік Алесь Ваўчок.

**Малюшыцкі сельсавет**

Сяло Малюцічы (Малюшычы) Навагрудскага павета ўпамінаецца упершыню ў XV стагоддзі, як падараванае вялікім князям літоўскім спачатку К. Свірылю, а затым Ф. Чартарыйскаму. У 1532 годзе сяло Малюшычы перададзена татарскаму князю Ахмет Улану які пазней заснаваў мястэчка (прывілей на таргі і корчмы). “6 кастрычніка 1932 года было дазволена мець торг у суботу харужаму татарскаму Ахмету Улану у яго частцы маёнтка Малюшыч Наваградскага павета” – (Метрыка ВКЛ. Спр.17, арк.330). У 1683 годзе сяло і маёнтак Малюшычы Навагрудскага павета. З пачатку XXVIII стагоддзя ўладальнікамі былі Усьманы і Багдановічы. У наваколлі сяла былі ўладанні князя С. Чымашэвіча (адкуль пашла назва вёскі Машэвічы), княгіні Давідовіч-Уланавай і іншай шляхты. З 1777 года у сяле налічвалася тры карчмы і шынок, а ў наваколлі размяшчаліся фальваркі Д.Улана, Я.Ахмацэвіча, Г.Чачота і іншыя. З сярэдзіны XIX і на пачатку XX стагоддзя сяло Малюшычы і маёнтак у Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1883 годзе у сяле Малюшычы адкрыта школа

пісменнасці, а з 1897 года дзейнічалі хлебазапасны магазін і дзве карчмы. З 1921 года па 1939 год сяло Малюшычы у Райчанскай вясковай гміне Навагрудскага павета і ваяводства. З верасня 1921 годзе польскімі ўладамі праведзена хутарызацыя сялянскіх гаспадарак. У 1930 годзе адкрыта польская пачатковая школа, дзейнічае падпольная ячэйка КПЗБ.

З **12.10.1940** вёска Малюшычы - цэнтр сельсавета Валеўскага раёна Баранавіцкай вобласці, ў складзе вёскі Аколіца, Волца, Даўгінава, Лукашын, Навасёлкі (да 16.07.1954 года), Скорава. Вёска Машэвічы - цэнтр сельсавета Валеўскага раёна Баранавіцкай вобласці, ў складзе вёскі Баранавічы, Белая, Моладава, Руднікі, Сапатніца, Селішча, Цімошкавічы, Яруга. Вёска Горныя Руткавічы - цэнтр Руткавічскага сельсавета Валеўскага раёна Баранавіцкай вобласці, ў складзе вёскі: Вялікія Тупалы, Забалацце, Зарэчча, Малыя Тупалы, Новыя Руткавічы (да 16.07.1954 года), Палужжа (да 16.07.1954 года), Працяневічы (да 16.07.1954 года), Савашы (да16.07.1954 года). Вёска Сэрвач ўваходзіла ў Асташынскі сельсавет Валеўскага раёна Баранавіцкай вобласці.

З 25.11.1940 вёска Малюшычы - цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Баранавіцкай вобласці, ў складзе вёскі Аколіца, Волца, Даўгінава, Лукашын, Навасёлкі, Скорава, а з 08.01.1954 года вёска Малюшычы - цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці, ў складзе вёскі Аколіца, Волца, Даўгінава, Лукашын, Навасёлкі (з 16.07.1954 года ў складзе Карэліцкага сельсавета), Скорава, Сэрвач. Старшыні сельсавета: Расюкевіч А.М., Шэга Ф.К.

З 02.12.1961 года Малюшыцкі сельсавет скасаваны. З 16.07.1954 года вёскі Горныя Руткавічы, Новыя Руткавічы, Палужжа, Працяневічы, Навасёлкі, Савашы ўваходзяць у склад Карэліцкага сельсавета., а з 30.04.1958 года яны ўваходзяць у склад Карэліцкага пассавета. Вёскі Малюшычы, Аколіца, Волца, Даўгінава, Лукашын, Скорава, Сэрвач з 02.12.1961 года ўваходзяць ў склад Райцаўскага сельсавета.

З 27.09.1963 года ўтвораны Зарэччанскі сельсавет, вёска Зарэчча - цэнтр сельсавета Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, ў складзе вёскі

Баранавічы, Белая, Забалацце, Машэвічы, Моладава, Руднікі, Сапатніца, Селішча, Цімошкавічы, Яруга. З 30.09.1968 года цэнтр сельсавета перанесены ў вёску Баранавічы і ўтвораны Баранавіцкі сельсавет Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці, ў складзе вёскі Белая, Зарэчча, Забалацце, Машэвічы, Моладава, Руднікі, Сапатніца, Селішча, Цімошкавічы, Яруга. З 11.02.1972 года да Баранавіцкага сельсавета далучаны вёскі Горныя Руткавічы, Новыя Руткавічы.

23.07.1979 года зноў утвораны Малюшыцкі сельсавет вёскі Аколіца, Баранавічы, Белая, Волца, Вялікія Тупалы, Горныя Руткавічы, Даўгінава, Забалацце, Зарэчча, Лукашын, Малыя Тупалы, Машэвічы, Моладава, Новыя Руткавічы, Руднікі, Сапатніца, Селішча (не існуе з1995 г.), Скорава, Сэрвач, Цімошкавічы, Яруга. Старшыні сельсавета: Халупка І.К., Руц М.М., Адамушка І.К., Лаўнікувіч І.С., Брэган А.К., Дзірвук В.А.

Згодна з рашэннем Гродзенскага аблсавета ад 28.12.2007 года № 56 да Малюшыцкага сельсавета далучаны вёскі Палужжа, Равіны, Навасёлкі, Качычы, Савашы і пасёлак Людвікі. З 28.12.2010 вёска Малюшычы пераўтворана ў аграгарадок Малюшычы.

*Як утвараўся СВК “Малюшычы”*

З 25.04.1940 года створаны калгас імя Калініна, вёска Малюшычы (канчаткова не арганізаваны). Адноўлены калгас імя Калініна, вёска Малюшычы і Даўгінава з 06.02.1948 года старшыня Расюкевіч А.М. З 11.10.1949 года арганізаваны калгасы: “Новае жыццё”, вёска Сэрвач, старшыня Ярош І. С., імя Якуба Коласа (з 24.02.1950 года перайменаваны ў “Чырвоны Кастрычнік”, вёска Лукашын, старшыня Ціт П. Д., калгас імя Янкі Купалы, вёска Аколіца, старшыня Худніцкі І. К., калгас “Барацьбіт”, вёска Скорава старшыня Галынскі С. П., калгас імя Мічурына, вёска Волца, старшыня Марцынкевіч А.Ф. З 30.03.1952 года калгасы “Новае жыццё”, “Чырвоны Кастрычнік”, імя Янкі Купалы, “Барацьбіт”, імя Мічурына аб`яднаны с калгасам імя Калініна, вёска Малюшычы. У 2003 годзе калгас імя Калініна перайменаваны ў СВК ”Малюшычы”. Старшыні калгаса:

Расюкевіч А.М. (02.1948 г. - 02.1954 г.), Зантовіч А.А. (02.1954 г. - 03.1988 г.), Сараф А.І. (03.1988 г. - 02.1997 г.), Мацкевіч В.І. (02.1997 г. - 11.1997 г.), Александровіч І.М. (12.1997 г. - 11.1998 г.), Арцюх К.В. (11.1998г. - 03.2001 г.), Кулініч А.М. (03.2001 г.- 03.2011 г.), Белы Г.А. (03.2011 г. -07.2013 г.), Барыскін С.М. з 07.2013 г.

*Утварэнне СВК "Машэвічы-Лянок".* З 02.09.1948 года арганізаваны калгас "Перамога", вёска Баранавічы, старшыня Гурын М.А., з 25.12.1948 года калгас "Савецкая Беларусь", вёска Цімошкавічы, старшыня Чубрык У.С., з 03.1949 года калгас імя Фрунзе, вёска Руднікі, старшыня Каратай Р.М., з 29.07.1949 года калгас імя Суворава, вёска Сапатніца, старшыня Чубрык К.М., з 20.09.1949 года калгас імя Кутузава, вёска Яруга, старшыня Яхант І.М., з 15.10.1949 года калгас "Дружба" вёска Машэвічы старшыня Яусей М.С., з 24.07.1949 года калгас "Чырвоная ніва", вёска Моладава, старшыня Яусей Н.П., з 28.11.1949 года калгас "Маладая гвардыя", вёска Селішчы старшыня Гурын І.Г. З 16.03.1951 года калгасы "Савецкая Беларусь", імя Фрунзе, імя Суворава, імя Кутузава, "Дружба", "Чырвоная ніва", "Маладая гвардыя" аб`яднаны с калгасам "Перамога", вёска Баранавічы старшыня Гурын М.А. У сакавіку 1957 года калгас "Перамога" пераймінаваны ў калгас "Сцяг Перамогі", вёска Баранавічы, старшыні: Гурын М.А., Барэйка М.М., Грынашкевіч В.И., Межань В.В., а з 30.07.2003 года пераймінаваны ў СВК "Машэвічы-Лянок", вёска Баранавичы, старшыні: Межань В.В., Барыскін С.М., Валчэцкі М.М., Маковік В.В. 03.11.2007 года СВК "Машэвічы-Лянок" далучаны да СВК "Малюшычы".

Утварэнне калгаса "Шлях Ільіча". З 07.09.1948 года арганізаваны калгасы імя Кірава, вёска Белая і імя Фрунзе, вёска Вялікія Тупалы. З 22.10.1949 года арганізаваны калгасы імя Андрэева, вёска Забалацце і "Шлях Ільіча", вёска Зарэчча. З 29.08.1949 года арганізаваны калгасы імя Горкага, вёска Малыя Тупалы і "Чырвоная зорка", вёска Горныя Руткавічы. З 28.07.1951 года калгас "Чырвоная зорка" далучаны да калгаса "Зара камунізму", вёска Палужжа. У вёсцы Новыя Руткавічы з 29.08.1949 года

арганізаваны калгас “Новы шлях”. З 11.09 1951 года калгасы імя Кірава, імя Фрунзе, імя Андрэева і “Шлях Ільіча” аб`яднаны ў новы калгас “Шлях Ільіча” вёска Вялікія Тупалы старшыні: Сяляўка Б. Е., Ляўкевіч Г. К. З 12.03.1979 года калгасы імя Горкага, “Новы шлях” і “Шлях Ільіча” далучаны да калгаса імя Калініна вёска Малюшычы.

Знакамітыя землякі: аграгарадок Малюшычы (былая вёска Селішча) - польскі паэт Ян Чачот, вёска Моладава - збіральнікі беларускага фальклору Логін А.К. і Логін Я.К., вёска Сэрвач - беларускія грамадскія дзеячы, пісменнікі-мемуарысты Маскевіч С.І. і Маскевіч Б.К., генерал-лейтэнант Данько У.А.

**Райцаўскі сельсавет**

Пра сядзібу ў Райцы ўпамінаецца ўпершыню ў 1530 годзе (маёнтак Шлізняў). У 1535 годзе ў сяле Райца пабудавана царква, якая была спалена пры набегах крымскіх татар. “У 1596 годзе быў пацвержаны кірмаш пры царкве св. Спаса ў вёсцы Райцы Наваградскага павета. Ён адбываўся на праваслаўнае свята св. Спаса, а даход ішоў на свяшчэнніка царквы і *дажывотнага* пана той зямлі Аяксандра Бральніцкага.” – (Метрыка ВКЛ. Спр.83, арк.83). У 1777 годзе маёнтак Райца належаў Ф. Раецкаму і ўключаў панскі двор, сяло Райца. З 1799 сяло Райца ўваходзіла ў склад маёнтка Забердава. У 1817 годзе памешчыкам Раецкім пабудавана Спаса-Праабражэнская царква, першапачаткова як касцёл-пахавальня. У 1863 годзе са згоды сям’і Раецкіх касцёл быў асвенчаны як праваслаўны храм у гонар Праабражэння Гасподняга. У 1862 годзе адкрыта сельская прыходская школа, у 1890 годзе народнае вучылішча. У 1897 годзе вадзяны млын, карчма, вінакурны завод. У канцы XVIII і пачатку XIX сттагоддзя брат Марылі Верашчакі Юзаф Верашчака ажаніўся на адной з маладых Раецкіх. Затым сядзібу Раецкіх-Верашчакаў купіў унук Марылі Верашчакі – граф Францішак Путткамер. У 1910 годзе сядзібавы дом адданы ў пасаг дачцэ Яніне, калі тая, вышла замуж  за прафесара Кракаўскага ўніверсітэта Адама Жалтоўскага.

У XIX стагоддзя і да пачатку XX стагоддзя сяло Райца цэнтр Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. На пачатку 1920-х гадоў польскімі ўладамі праведзена  хутарызацыя сялянскіх гаспадарак. З 1921-1939 гады маёнтак Райца цэнтр вясковай гміны Навагрудскага ваяводства і павета. Гміна вясковая Райца ў складзе: - вёскі Баранавічы, Валеўка*, Валокі, Волца, Даўгінава, Дуброва, Забалацце, Забердава, Караліны, Катлова*, Лагаватка, Лагадкі*, Лукашын, Малюшычы, Мацешыцы**, Машэвічы, Міратычы, Мокрава, Моладава, Мондзін*, Навасады*, Навасёлкі, Нязнанава*, Плахава*, Радагошча*, Райца, Руднікі, Сапатніца. Селішча, Сянежыцы**, Печышча, Хвалава, Цімошкавічы, Шчонава, Юрздыка, Яруга, Ятвезь; - фальваркі Арэхава**, Волца, Дзягцяроўшчына*, Зацішша**, Ізабелін*, Катлова*, Косічы Малыя*, Лагадкі*, Лыскоўшчына*, Малюшычы, Мацешыцы**, Машэвічы, Міратычы 7 фальваркаў, Моладава 2 фальваркі, Мондзін*, Мухаўка**, Новы двор*, Падпрылукі*, Падчамброўка, Плужыны Старыя, Пяшчанка, Райца, Руднікі, Сёгда, Сянежыцы**, Чамбровак, Чамброў, Шчонава, Янавы Гай*; - аколіца Волца; - асады: Антонава*, Волца, Гай Стары*, Грэнова, Забердава, Зарэчча, Кравічы*, Лапінічы*, Міратычы, Мондзін*, Падлугаватка, Платава*, Ялавічы*; - калоніі: Грабаўка, Лагадкі*; - леснічоўкі: Галянова, Падмондзін*. [*у цяперашні час тэрыторыя Валеўскага сельсавета Навагрудскага раёна, ** у цяперашні час тэрыторыя Ваўкавіцкага сельсавета Навагрудскага раёна.]

У верасні 1921 года ў фальварку Райца чатыры двары, царква, жаночы манастыр, пошта, вадзяны млын, тры прыватныя лаўкі, каапeратыўная ашчадна-крэдытная каса (каса Стэфчыка). У маёнтку была сыраварня. Працавала польская пачатковая пяцікласная школа. Калі тэрыторыя сельсавета была ў складзе Рэчы Паспалітай да паселішча Русацін была пракладзена чыгунка (вузкакалейка), па якой у Польшчу вывозіліся лес, прыродныя выкапні гліна і жвір. Кар’ер гліны быў у весцы Забердава, а жвіру недалёка ад вескі Русацін. У 1930-х гадах на цяперашняй тэрыторыі сельсавета быў пабудаваны і пачаў працаваць цагельны завод. У пачатку XX

стагоддзя Адам і Яніна Жалтоўскія пераехалі ў Кракаў, а сядзібавы дом у Райцы разам з бібліятэкай, калекцыямі жывапісу і антыкварыяту падаравалі манашкам-паллатынкам. Манашкі жылі ў гэтым доме з 1932 года па 1943 год, а потым з’ехалі ў Заходнюю Еўропу. Мястэчка Райца неўзабаве здрабнела да маштабаў вёскі. Пасля вайны ў колішнім шляхецкім доме размясціўся шпіталь, пазней была бальніца і паліклініка і яшчэ пазней – вясковая амбулаторыя, якая знаходзілася да канца 1990-х годоў.

З **12.10.1940** года вёска Райца - центр сельсавета Валеўскага раёна Баранавіцкай вобласці ў складзе вёскі Галянова (цяпер хутар), Дуброва, Рамейкі, Хвалава, Шчонава, Юрздыка (з 30.06.1964 года Зелянец). Вёска Міратычы - цэнтр сельсавета Валеўскага (з 25.11.1940 года Карэліцкага) раёна Баранавіцкай (з 08.01.1954 года Гродзенскай) вобласці ў складзе вёскі: Забердава, Караліны, Лагаватка, Плужыны, Русацін, Сёгда, Скрышава, Печышча (з 30.06.1964 года Францішкова), Ятвезь. З 25.11.1940 года вёска Райца - цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Баранавіцкай вобласці. У снежні 1940 года пачала функцыянаваць участковая бальніца ў весцы Райца. У цяперашні час амбулаторыя ўрача агульнай практыкі, а з 08.01.1954 года вёска Райца - цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці і на гэты час была пабудавана сямігадовая школа, якая ў канцы 50-х стала сярэдняй. Да Райцаўскага сельсавета 16.07.1954 года далучаны Міратыцкі сельсавет, а з 02.12.1961 па 23.07.1979 у склад Райцаўскага сельсавета ўваходзяць вёскі Малюшычы, Аколіца, Волца, Даўгінава, Лукашын, Скорава, Сэрвач якія раней знаходзіліся ў Малюшыцкім сельсавеце. З 25.12.1962 года вёска Райца - цэнтр сельсавета Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, а з 06.01.1965 года вёска Райца зноў центр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Старшыні сельсавета: Мядзведь С.А., Дубень Г.М., Лапацкі Ц.Дз., Шушкевіч Ул.А., Расюкевіч А.М., Машчонскі Н.Ю., Шчарбакоў Ул. А., Бушэйка С.М., Валюшкін В.Дз., Жыдко Я.Дз., Шчарбакоў П.М., Ляўкевіч Г. К., Бабко В. Ф.

З 28.12.2010 года вёска Райца пераўтворана ў аграгарадок Райца Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

На 01.01.2000 года у сельсавеце ўчастковая бальніца, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, тры магазіны, комплексна-прыёмны пункт. У 2003 годзе адноўлены ў першапачатковым выглядзе праваслаўны храм і асвечаны ў гонар святой вялікапакутніцы Варвары. Сядзібны дом XIX стагоддзя і жылы дом XVIII стагоддзя з’яўляюцца помнікамі архітэктуры, а царква Святой Варвары - гістарычным помнікам. Помнікам прыроды рэспубліканскага значэння з’яўляецца мясцовы парк.

Знакамітыя землякі: вёска Райца - доктар тэхнічных навук, прафесар Машчонскі А.А., вёска Скрышава - кандыдат тэхнічных навук Каралько А.А., вёска Шчонава - кандыдат філалагічных навук Барэйка А.М., вёска Зялянец - кандыдат эканамічных навук Вайтовіч Л.Ц., вёска Сёгда - кандыдат эканамічных навук Ціхановіч А.П., вёска Дуброва - беларускі вучоны Навумовіч Г.М., вёска Плужыны - Герой Савецкага Саюза Гастэла М.Ф.

**Баранчанскі сельсавет**

Першыя пісьмовыя ўпамінанні пра Варончу як сяло і маёнтак Наваградскага павета былі ў XVII стагоддзі. У 1666 годзе сяло і маёнтак Варонча перайшоў у валоданне Брэсцкага ваяводы Стэфана Курча. У 1799 годзе маёнтак у складзе панскі двор і сёлы Варонча, Літараўшчына, Равіны. На гэты час былі пабудаваны і дзейнічалі вадзяны і ветраны млыны. У другой палавіне XVIII стстагоддзя ў Варончы былі пабудаваны два палацы, касьцёл, скарбніца, флігелі, гаспадарчыя пабудовы, невялікі парк.

У выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 годзе Варонча ў складзе Расійскай імперыі Цырынская воласць, Наваградскі павет, Мінская губернія. У розны час сяло і маёнтак Варонча знаходзілася ў валоданні магнатаў Несялоўскіх, Кабылінскіх, Мерзаеўскіх, Любанскіх. У 1858 годзе ў маёнтак уваходзілі панскі двор Варонча, вёскі Літараўшчына, Раманы, Бабонеўка, Плужыны, Равіны, Русацін. Гэтыя мясціны падабаліся паэтам

Адаму Міцкевічу і Яну Чачоту. У 1898 годзе адзін з палацаў перабудавалі пад бровар. У 1897 годзе ў маёнтку дзейнічалі касцёл Святой Ганны, хлеба-запасны магазін, вінакурны завод, вадзяны млын, карчма. Згодна з Рыжкім мірным дагаварам у 1921 годзе Варонча ў складзе Цырынскай вясковай гміны Навагрдзкага павета і ваяводства. З верасня 1921 года польскімі ўладамі праведзена  хутарызацыя сялянскіх гаспадарак. З 1939 года цяперашняя тэрыторыя Варанчанскага сельсавета ўваходзіла ў склад БССР. У вёсцы адкрылася беларуская сямігадовая школа, а  з **12.10.1940** года вёска Варонча - цэнтр сельсавета Валеўскага раёна Баранавіцкай вобласці, ў складзе вёскі: Белыя Лугі, Дашкі (не існуе з 1949 г.) Горбатавічы, Куневічы, Літараўшчына, Мінакі, Равіны, Раманы, Сапліца (не існуе з1958 г.), Трасейкі, Труднава. Вёскі Падгайна ўваходзіла ў Цырынскі, Саленікі і Тіневічы ў Міратыцкі сельсавет Валеўскага раёна Баранавіцкай вобласці. З 25.11.1940 года вёска Варонча - цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Баранавіцкай вобласці, а з 08.01.1954 года вёска Варонча - цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці і з 25.12.1962 года вёска Варонча - цэнтр сельсавета Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. З 06.01.1965 зноў вёска Варонча - цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Старшыні сельсавета: Канкудовіч І.П., Янкоўскі К.В., Мяць І.І., Грамыка П.І., Дрозд М.І., Пакроўскі А.Ю., Варабей І.І., Мяць І.І., Еўлаш М.І., Гоцка Ул. Дз., Аппельт Р.Г., Грушэўскі А.І., Янкоўскі Г.Дз., Філіпчык Г.К., Худоба Р.І., Баранаў С.П.

З 21.08 1989 года па 28.09.1995 года тэрыторыя Варанчанскага сельсавета ў складзе Цырынскага сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці, а затым сельсавет быў адноўлены. У 1895 годзе ўведзены ў эксплуатацыю Варанчанскі спіртавы завод. У канцы 1940 года праведзена рэканструкцыя і завод знаходзіцца ў рэспубліканскім падпарадкаванні. У цяперашні час Варанчанскі філіял РУП “Гродзенскі лікёра-гарэлачны завод”. Дырэктары завода Каламійцаў К.П., Генка Б.М., Пупо М.Б., Хоміч І.А., Янкоўскі Г.Дз., Кітун В Ул., Яцук А.А., Тур С.І.

З 28.12.2010 года вёска Варонча пераўтворана ў аграгарадок Варонча Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

*Як утвараўся СВК “Свіцязянка 2003”.*

*Утварэнне калгаса імя Гастэлы.* З 11.02.1948 года арганізаваны калгас “Першае мая”, вёска Щонава, старшыня Дубень Р.П., з 02.09.1948 года калгас “Шлях да камунізму”, вёскі Райца і Юрздыка (з 30.06.1964 года Зелянец) старшыня Сак М.К., з 29.01.1949 года калгас імя Гастэлы, вёска Плужыны старшыня Флейта М.І., з 15.08.1949 года калгас “Іскра”, вёскі Хвалава і Галянова, старшыня Цярэшка А.С., з 09.09.1949 года калгас “17 Верасня”, вёска Дуброва, старшыня Філончык Я.М., з 24.09.1949 года калгас “Маладая гвардыя”, вёска Рамейкі, старшыня Захарчук І.А., з 24.09.1949 года калгас “Кастрычнік”, вёскі Русацін і Лагаватка, старшыня Пацко І.М. На 24.02.1952 года калгасы “Першае мая”, “Шлях да камунізму”, імя Гастэлы, “Іскра”, “17 Верасня”, “Маладая гвардыя”, “Кастрычнік” аб`яднаны ў калгас імя Гастэлы цэнтр вёска Райца. Старшыні калгаса: Лапацкі Ц.Д. (1952-1956), Шчарбакоў У.А. (1956-1958гг.), Шэга І.І. (1958-1963гг.), Шыбут С.А. (1963-1975гг.), Багушэвіч А.А. (1975-1976гг.), Сакалоў А.М. (1976-1996гг.), Кулініч А.М. (1996-1998гг.), Яусейчык М.М. (1998-2001гг.), Манько І.В. (2001-2002гг.), Галавач У.А. (01.02.2002гг.). З 05.03.2003 года Калгас імя Гастэлы пераймінаваны ў СВК “Свіцязянка 2003”.

*Утварэнне калгаса імя Якуба Коласа.* З 05.03.1950 года арганізаваны калгас імя Якуба Коласа, вёска Грабаўка, старшыня Андрэйчык А.С., з 12.08.1949 года калгас “Маладая гвардыя” , вёска Скрышава старшыня Арцюх Ю.П., з 08.10.1949 года калгас “Перамога працы”, вёска Забердава, старшыня Сак І.М., з 08.10.1949 года калгас “Новае жыццё”, вёска Францішкова, старшыня Сак І.А., з 19.11.1949 года калгас імя Крупскай, вёскі Караліны, Сёгда, старшыня старшыня Сак М.І., з 09.04.1949 года калгас імя Дзяржынскага, вёска Міратычы, старшыня Урбановіч У.М., з 14.08.1950 года калгас імя Васілеўскага, вёска Ятвезь. На 05.03.1951 года калгасы імя Якуба Коласа, “Маладая гвардыя”, “Перамога працы”, “Новае жыццё”, імя

Крупскай, імя Дзяржынскага, імя Васілеўскага аб`яднаны ў калгас імя Якуба Коласа цэнтр вёска Міратычы. Старшыні калгаса: Апёнкін П.Ф. (1951-1961гг.), Савоська М.У. (1961-1971гг.), Грынюк А.С. (1971-1979гг.). З 12.03.1979 года калгас імя Якуба Коласа далучаны да калгаса імя Гастэлы вёска Райца

*Утварэнне СВК "Варонча"*. З 18.10.1940 года утвораны калгас імя Варашылава, вёска Варонча (канчаткова не арганізаваны), з 16.09.1949 года адноўлены калгас імя Варашылава, вёска Варонча, з 16.09.1949 арганізаваны калгас імя Ракасоўскага, вёскі Горбатавічы і Куневачы, з 23.02.1949 года калгас імя Савецкай Арміі, вёска Мінакі і Трасейкі, з 23.03.1949 года калгас "Прамень рэвалюцыі", вёска Равіны, з 25.09.1949 года калгас імя Кірава вёска Падгайна, з 02.11.1949 года калгас імя Арджанікідзе, вёскі Раманы і Белыя Лугі, з 24.09.1949 года калгас "Чырвоны партызан", вёскі Саленікі і Ціневічы, з 11.10.1949 года калгас імя Мічурана, вёска Труднава, з 10.03.1950 года калгас імя ВС СССР, вёска Літараўшчына. На 25.09.1951 года калгасы імя Варашылава, імя Ракасоўскага, імя Савецкай Арміі, "Прамень рэвалюцыі", імя Кірава, імя Арджанікідзе, "Чырвоны партызан", імя Мічурана, імя ВС СССР аб`яднаны ў калгас "Савецкая Армія" - цэнтр вёска Варонча. З 21.04.1965 калгас "Савецкая Армія" перайменаваны ў саўгас "Варонча" - цэнтр вёска Варонча. Дырэктары: Кулак С.А., Сенька А.М. З 1971 года да 1988 года ў складзе саўгаса "Варонча" вёска Пряцяневічы. З 12.01.1988 года да 22.01.1994 саўгас "Варонча" у складзе калгаса "Ленінскі шлях" - цэнтр вёска Цырын. У студзені 1994 года ад калгаса "Ленінскі шлях" аддзелена тэрыторыя быўшага саўгаса "Варонча" і арганізаваны калгас "Варонча" цэнтр вёска Варонча. З 05.08.2003 калгас "Варонча" перайменаваны ў СВК "Варонча" цэнтр вёска Варонча. Старшыні: Паўловіч І.М., Юшкевіч А.І., а з 15.11.2005 СВК "Варонча" далучаны да СВК "Свіцязянка 2003" - цэнтр вёска Райца.

Знакамітыя землякі: вёска Саленікі Герой Працы Беларусі (1934г.) Барысевіч А.І.

**Турэцкі сельсавет**

Пасяленне Турэц упершыню ўпамінаецца ў 1276 годзе ў валынскай хроніцы, калі галіцка-валынскія князі разам з татарамі пайшлі на Наваградак і Гродна. У XIV стагоддзі тэрыторыя знаходзілася ва ўладанні князя Уладзіміра Альгердавіча, а пазней сын Уладзіміра князь Аляксандр (Алелька) перадаў землі ў наваколлі пасялення Турэц Лаўрышаўскаму манастыру. З пачатку XVI стагоддзя пасяленне Турэц атрымала статус мястэчка, ўваходзіць у склад Наваградскага павета і знаходзіцца ва ўладанні магнатаў Хадкевічаў. У 1748 годзе ў цэнтры мястэчка быў пабудаваны з уваходнай брамай усадзебны дом Хадкевічаў. У мястэчку пасяліліся яўрэі, якія займаліся пераважна дробным гандлем. З XVII стагоддзя ў мястэчку існаваў невялікі касцёл, пабудаваны гетманам К. Хадкевічам. Недалёка ад касцёла была пабудавана грэка-каталіцкая царква, а таксама дзейнічала праваслаўная драўляная Юр'еўская царква.

У выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 годзе мястэчка Турэц апынулася ў складзе Расійскай імперыі Ярэміцкай воласці, Наваградскага павета, Мінскай губерні. У 1880 годзе ў мястэчку мелася дзве праваслаўныя царквы, сінагога, яўрэйская малітоўная школа, тры млыны, дзве карчмы і пяць крам, а ў наваколлі фальварак і маёнтак Ліпніцкіх і Свідзінскіх. У 1888 годзе ў мястэчку пабудавана новая мураваная царква, а ў 1890 годзе адкрылася народнае вучылішча. У 1897 годзе ў Турцы мелася царква, капліца, два яўрэйскія малітоўныя дамы, народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, пошта, васемнаццаць крам, два ветраныя млыны, семь заездных дамоў.

Пасля Рыжскага мірнага дагавора ў 1921 годзе мястэчка Турэц у складзе Польшчы Ярэміцкая вясковая гміна Наваградскага (з 1926 г. Стаўбцоўскага) павета Наваградскага ваяводства. У 1926 годзе ў мястэчка Турэц перанесены цэнтр вясковай гміны з мястэчка Ярэмічы і мястэчка Турэц стала цэнтрам вясковай гміны Стаўбцоўскага павета Наваградскага ваяводства. У верасні 1921 года польскімі ўладамі праведзена хутарызацыя

сялянскіх гаспадарак, а ў мястэчку на гэты час дзейнічае сямікласная агульнаадукацыйная школа, клуб, прыватная бібліятэка, пошта, пяць корчмаў, а з 1931 года тры млыны, двадцаць пяць крам і ашчадна-крэдытная каса (каса Стэфчыка).

З 1939 года мястэчка Турэц у складзе БССР і статус мястэчка паніжаны да вёскі. З **12.10.1940** года вёска Турэц цэнтр сельсавета Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці, ў складзе вёскі Браносава, Загор'е, Качаны, Лыкавічы, Навасёлкі, Рапьева, Чыжыноўцы. Вёска Вялікая Слабада - цэнтр сельсавета Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці, ў складзе вёскі Вялетава, Тарасавічы, а вёска Некрашэвічы - цэнтр сельсавета Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці, ў складзе вёскі Беразавец, Крынкі (з 16.07.1954 года ў Луцкім сельсавеце). Вёска Маласельцы ўваходзіла ў склад Скорычскага сельсавета. З 25.11.1940 года вёска Турэц цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Баранавіцкай вобласці. У лістападзе1944 года ў вёсцы пачала функцыянаваць участковая бальніца, у цяперашні час амбулаторыя ўрача агульнай практыкі. З 08.01.1954 года вёска Турэц - цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. З 16.07.1954 года да Турэцкага сельсавета далучаны Вялікаслабодскі сельсавет, вёскі Вялетава, Тарасавічы і вёска Маласельцы Скорычскага сельсавета.

З 25.12.1962 года ў сувязі з укрупненням раёнаў  вёска Турэц - цэнтр сельсавета Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, а з 06.01.1965 года вёска Турэц зноў центр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. З 12.05.1983 да Турэцкага сельсавета далучаны вёскі Беразавец, Крынкі, Некрашэвічы Луцкага сельсавета. Старшыні сельсавета: Бурак В.П., Суббоцін М.Л., Саўка Ул.Ул., Балабановіч М.І., Шапавалава В.Ф., Карп А.І., Гарох І.М., Хамко Ул.А., Кулак І.А., Дзяшкевіч А.А., Кавалевіч В.М., Дзяшкевіч А.А., Ходар В.В. З 28.12.2010 года вёска Турэц пераўтварана ў аграгарадок Турэц Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

*Як утвараўся СВК імя Чарняхоўскага.*

З 26.02.1948 года арганізаваны калгас імя Чарняхоўскага, вёска Турэц старшыня Лаўровіч М.В., з 21.08.1948 года калгас імя Сталінскай Канстытуцыі, вёскі Рап'ева і Навасёлкі старшыня Грамыка У.М., з 26.08.1948 года калгас "Бальшавік", вёска Чыжыноўцы, старшыня Смалянка І.П., з 28.08.1948 года калгас "Рассвет", вёска Качаны, старшыня Гурскі Г.І., з 13.01.1949 года калгас "30 гадоў БССР", вёска Лыкавічы, старшыня Нікішын М.С., з 19.01.1949 года калгас "Запаветы Ільіча", вёска Загор'е старшыня Брыль Н.А., з 16.01.1949 года калгас "Праўда", вёска Маласельцы, старшыня Крэнь, з 02.08.1949 года калгас "Беларусія", вёска Браносава, старшыня Мацко Ф.С. На 04.08.1950 года калгасы імя Чарняхоўскага, імя Сталінскай Канстытуцыі, "Бальшавік", "Рассвет", "30 гадоў БССР", "Запаветы Ільіча", "Праўда", "Беларусія" аб'яднаны ў калгас імя Чарняхоўскага - цэнтр вёска Турэц. У 2006 годзе калгас імя Чарняхоўскага перайменаваны ў СВК імя Чарняхоўскага. Старшыні калгаса: Саўка У.У (1950-1961гг.), Аўдзейчык (1961-1976гг.), Дзяшкевич А.А. (1976-1983гг.), Пахолак М.А. (1983г.), Сагыга У.М. (1983-2004гг.), Тур С.В. (2004-2011гг.), Шуляк Н.Н. (2011-2013гг.), Аляшкевич С.У. (2013г.).

*Утварэнне калгаса імя Дзмітрыева.* На 17.04.1940 года ўтвораны калгас імя Молатава, вёска Вялікая Слабада (канчаткова не арганізаваны), а з 22.07.1949 года адноўлены і перайменаваны ў калгас імя Дзмітрыева. З 01.08.1949 года арганізаваны калгас імя Чапаева, вёска Вялетава, з 09.09.1949 года калгас імя Мічурына, вёска Тарасавічы. На 23.02.1951 года калгасы імя Дзмітрыева, імя Чапаева, імя Мічурына аб'яднаны ў калгас імя Дзмітрыева - цэнтр вёска Вялікая Слабада. Старшыні калгаса: Чабярачка К.І. (1951-1952гг.), Кіслухіна Я.Ц. (1952-1972гг.), Дзяшкевіч А.А. (1972-1976гг.). З 25.12.1976 г. калгас імя Дзмітрыева далучаны да калгаса імя Чарняхоўскага - цэнтр вёска Турэц.

*Утварэнне калгаса імя Суворава.* З 12.04.1940 года ўтвораны калгас імя Варашылава, вёска Некрашэвічы (канчаткова не арганізаваны), а ў пасляваенны час на 09.03.1946 года быў адноўлены. З 21.08.1948 года

арганізаваны калгас імя Сталіна, вёска Беразавец, які з 02.03.1957 года перайменаваны ў калгас імя Суворава. З 17.08.1948 года арганізаваны калгас Чырвоны партызан, вёска Крынкі. На 15.02.1951 года калгасы імя Варашылава, імя Суворава, Чырвоны партызан аб'яднаны ў калгас імя Суворава - цэнтр вёска Некрашэвічы. Старшыні калгаса: Цішчуроў І.Ф. (1951-1955), Машарскі Я.В. (1955-1964), Анішчык А.А.(1964-1979), Пахолак М.А.(1979-1983). З 13.01.1983 года калгас імя Суворава далучаны да калгаса імя Чарняхоўскага - цэнтр вёска Турэц.

Знакамітыя землякі: вёска Браносава - беларускі вучоны Кікель П.В., вёска Вялікая Слабада - генерал-лейтэнант Пулка-Дзмітрыеў А.Дз., вёска Загор'е - беларускі вучоны Ламан М.А., народны пісьменнік Янка Брыль, вёска Маласельцы - беларускі пісьменнік, акцёр Ламан П., вёска Некрашэвічы - беларускія вучоныя Палуян І.В. і Палуян У.А., вёска Турэц - беларускі пісьменнік Дзеркач А., акадэмік Фёдараў Ф.І., спявак Конюх П., беларускі вучоны Конюх У.С., беларускі пісьменнік Янка Маўр.

**Цырынскі сельсавет**

Пасяленне Цэрын упершыню ўпамінаецца ў 1432 годзе калі староства Цэрынскае Наваградскай зямлі Ягайла надаў двараніну Наваградзкай зямлі Севестрыяну Сегеню. Мястэчка Цырын вядома з XV стагоддзі як вялікакняжыцкае ўладанне. У канцы XVI стагоддзя ў Цырыне праводзіліся павятовыя соймікі. У 1596 годзе мястэчку Цырын быў пацвержаны кірмаш. "Тэрміны правядзення кірмашу ў мястэчку Цырын Наваградскага павета былі звязаны з часам правядзення кірмашу ў Капылі, для таго, каб купцы, якія варочаліся з капыльскага кірмашу, заязджалі ў Цырын." – [Метрыка ВКЛ. Спр.83, арк.345 адв. (1598 г.)].

З канца XVII пачатку XVIII стагоддзя мястэчка Цырын цэнтр староства Наваградскага павета. 05.07.1792 года кароль і вялікі князь Станіслаў Аўгуст Панятоўскі падцвердзіў Цырыну Магдэбурскае права і надаў яму герб у блакітным полі стаячы алень з залатым крыжам паміж рагамі.

У выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 годзе мястэчка Цырын ў складзе Расійскай імперыі цэнтр воласці Наваградскага павета. Станам на 1852 год у Цырыне пабудавана драўляная царква, а ў 1862 годзе адкрыта прыходская школа, з другой палавіны 1880 года пачало працаваць народнае вучылішча.

З канца XIX і да пачатку XX стагоддзя мястэчка Цырын цэнтр Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. На гэты час у мястэчку Цырын дзейнічалі валасная і мяшчанская ўправы, царква, дзве капліцы, яўрэйскі малітоўны дом, багадзельня, хлебазапасны магазін, вадзяны млын, рэгулярна праводзіліся кірмашы.

Пасля Рыжскага мірнага дагавора ў 1921 годзе мястэчка Цырын у складзе Польшчы цэнтр гміны Наваградскага павета і ваяводства. У гэты час у Цырыне дзейнічае пачатковая школа, пошта, прыватныя яўрэйскія крамы, ашчадна-крэдытная каса (каса Стэфчыка). З верасня 1921 года польскімі ўладамі праведзена хутарызацыя сялянскіх гаспадарак

Гміна вясковая Цырын у складзе: - мястэчка Цырын; - вёскі Аканавічы, Алізараўшчына*, Альшаны, Асташын, Бабонеўка, Баяры, Быковічы, Быткаўшчына*, Варонча, Вызарак*, Высадавічы*, Горбатавічы, Горнае Скабава*, Грэчыхі*, Дольнае Скабава*, Дорагава, Застадолле, Кайшоўка, Канцявы*, Карчова*, Краснае, Куневічы, Кутаўшчына*, Літараўшчына, Любанічы, Мінакі, Мітрапольшчына*, Падгайна, Пераралока*, Плужыны, Пянчын*, Равіны, Раманы, Рамейкі, Рудашы*, Русацін, Саленікі, Сэрвач, Трацэвічы*, Цінявічы; - фальваркі Альшаны, Асташын, Бельчыцы, Варонча, Графінаўшчына, Губічы*, Дварэц*, Дорагава, Драбышы*, Кайшоўка, Каросна*, Коця Гара*, Крывуха*, Кунявічы, Кутаўшчына, Любанічы, Мінакі, Новы Свет*, Паправа*, Правалока*, Плужыны, Праектавічы*, Равіны, Руднікі, Русацін, Скрабава*, Скрабаўка*, Сэрвач, Туганавічы, Ціневічы; - аколіцы: Белыя Лугі, Дашкі, Каросна*, Курачыцы*, Мехавічы*, Рубаўшчына*, Рукаўчыцы, Сапліцава, Трасейкі, Труднава, Церавічы, Шантуры*; - калонія Расаш*; - асада Стары Лес; -

леснічоўка Плужыны. [*у цяперашні час тэрыторыя Карчоўскага сельсавета Баранавіцкага раёна Брэстскай вобласці.].

З 1939 года мястэчка Цырын у складзе БССР і статус мястэчка паніжаны да вёскі. З **12.10.1940** года вёска Цырын - цэнтр сельсавета Валеўскага раёна Баранавіцкай вобласці, ў складзе вёскі: Аканавічы, Альшаны, Бабонеўка, Быкевічы, Красная, Рукаўчыцы, Церавічы. Вёскі Валокі, Мокрава ўваходзілі ў Малюшыцкі, Дарагава, Застадолле - у Варанчанскі, Кайшоўка – у Асташынскі сельсаветы Валеўскага раёна (з 25.11.1940 Карэліцкага) Баранавіцкай вобласці. З 25.11.1940 года вёска Цырын - цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Баранавіцкай вобласці. З лістапада 1944 года ў вёсцы Альшаны пачала функцыянаваць участковая бальніца, у цяперашні час амбулаторыя ўрача агульнай практыкі ў весцы Цырын. З 08.01.1954 года вёска Цырын - цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. З 16.07.1954 года вёскі Валокі, Дорагава, Застадолле, Кайшоўка, Мокрава, ў складзе ўтворанага Кайшоўскага сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці, а з 02.12.1961 года Кайшоўскі сельсавет далучаны да Цырынскага сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

У сувязі з аб`яднаннем раёнаў з 25.12.1962 года вёска Цырын - цэнтр сельсавета Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, а з 06.01.1965 у сувязі з разукрупненнем раёнаў вёска Цырын зноў цеэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Старшыні сельсавета: Грамыка П.І., Ахрэмка М.К., Марыкіна Д.В., Гоцка Ул.Дз., Грамыка П.І., Макарэвіч С.І., Мірачыцкі К.П., Пігаль М.Ул., Кудзін Л.В., Лазарчык І.І., Кавалевіч В.М., Худоба Р.І., Шамкаловіч В.Ул., Алексіевіч Дз.І., Зяленская Т.І., Худоба Р.І., Янкоўскі А.М., Атрашкевіч Л.Ф.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 09.09.2009 года № 450 "Аб зацвярджэнні афіцыйных геральдычных сімвалаў адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак Гродзенскай вобласці" заснаваны афіцыйныя геральдычныя сімвалы - герб і сцяг вескі Цырын. З 28.12.2010

года вёска Цырын пераўтварана ў аграгарадок Цырын Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

*Як утвараўся СВК "Цырын-Агра"*

*Утварэнне калгаса "Ленінскі шлях".* З 28.11.1946 года арганізаваны калгас імя Якуба Коласа, вёска Цырын, з 14.03.1948 года калгас "Чырвоны сцяг", вёскі Аканавічы і Рукаўчыцы, з 10.03.1949 года калгас "Чырвоная зорка", вёска Краснае, з 08.07.1949 года калгас "Ленінскі шлях", вёскі Быкевічы і Церавічы. На 20.07.1950 года калгасы імя Якуба Коласа, "Чырвоны сцяг", "Чырвоная зорка", "Ленінскі шлях" аб`яднаны ў калгас "Ленінскі шлях" - цэнтр вёска Быкевічы, а ў пачатку 60-х цэнтр калгаса вёска Цырын. У 2006 годзе калгас "Ленінскі шлях" перайменаваны ў СВК "Цырын-Агра". Старшыні калгаса: Грамыка П.І., Барэйка А.М. (1953 – 1958гг.), Паўловіч І.М., Слонаў А.В., Калодка А.А., Сладзінскі Р. Т., Янкоўскі А.М., Куленіч Н.Н., Куліні А.М.

*Утварэнне калгаса "Зара".* З 14.09.1948 года арганізаваны калгас "Рассвет", вёска Застадолле, з 01.01.1949 года калгас "Светлы шлях", вёскі Валокі і Мокрава, з 17.07.1949 года адноўлены калгас "Першае мая", вёска Кайшоўка (у 1940 годзе канчаткова не арганізаваны) старшыня Шчарбакоў П.М. З 11.08.1949 года арганізаваны калгас імя Дзімітрава, вёскі Альшаны і Бабонеўка, з 24.08.1950 года калгас імя Маленкова, вёска Дарагава. На 23.08.1951 года калгасы "Рассвет", "Светлы шлях", "Першае мая", імя Дзімітрава, імя Маленкова аб`яднаны ў калгас "Першае мая" - цэнтр вёска Кайшоўка, старшыня Шчарбакоў П.М. У 1957 годзе калгас "Першае мая" перайменаваны ў калгас "Рассвет", і ў 1963 годзе калгас "Рассвет" перайменаваны ў калгас "Зара" - цэнтр вёска Кайшоўка, старшыня Шчарбакоў П.М. З 24.12.1975 года калгас "Зара" аб`яднаны з калгасам "Ленінскі шлях" - цэнтр вёска Цырын.

Знакамітыя землякі: вёска Альшаны - беларускі вучоны Сак В.В.

**Ярэміцкі сельсавет**

У XVII стагоддзі мястэчка Ярэмічы ў Наваградскім павеце ўпамінаецца упершыню як рачная прыстань на Нёмане. У 1793 годзе ў выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай паселішча Ярэмічы  ў складзе Расійскай імперыі цэнтр Ярэміцкай воласці Наваградскага павета Мінскай губерні. У 1897 годзе ў  Ярэмічах дзейнівае валасная ўправа, царква, малітоўны дом, сінагога, яўрэйская малітоўная школа, царкоўна-прыходская школа, двукласнае народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, шэсць крамаў, карчма, а з 1912 года дзейнічала крэдытнае таварыства. У 1799 годзе мястэчка Ярэмічы знаходзіцца ва ўладанні магнатаў Хадкевічаў.

Пасля Рыжскага мірнага дагавора ў 1921 годзе мястэчка Ярэмічы ў складзе Польшчы цэнтр гміны Наваградскага павета Наваградскага ваяводства. Да палавіны 1920-х гадоў польскімі ўладамі праведзена хутарызацыя сялянскіх гаспадарак.

Гміна вясковая Ярэмічы у складзе: - мястэчкі Турэц, Ярэмічы; - вёскі Астраўкі, Баўцічы, Беразавец, Браносава, Быковічы, Вялікая Вобрына, Воўчае Балота, Вялетава, Вялікая Слабада, Даўгінава, Загор’е, Зарэчча, Качаны, Лыкавічы, Лядкі, Маласельцы, Малая Вобрына, Навасёлкі, Новае Сяло, Пагарэлка, Рап’ёва, Скорычы, Тарасавічы, Чыжыноўцы; - фальваркі Авульс, Алешкава, Баршчоўка, Беразавец, Бернатава, Браносава 4 фальваркі, Бродзішча, Вобрынь, Воўчае Балота, Вялетава, Качаны, Лыкавічы, Падзагор’е, Пузіневічы, Рап’ёва, Роскаш, Стакроць, Стары Двор, Турэц, Уцеха 4 фальваркі; - калоніі Румок, Студзёная; - асады Барок, Вобрынь (асада млыновая), Дуброва, Крынічнае, Лузінаўка, Печыска; - лесічоўка Крынічнае; - цагельня Гачкі.

З 1926 года мястэчка Ярэмічы ў Турэцкай гміне Стаўбцоўскага павета Наваградскага ваяводства.

З 1939 года мястэчка Ярэмічы ў складзе БССР і статус мястэчка паніжаны да вёскі. З **12.10.1940** года вёска Ярэмічы - цэнтр сельсавета Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці, ў складзе вёскі Быковічы, Вялікая Вобрына, Лядкі, Малая Вобрына, Першамайскі пасёлак, Пагарэлка. Вёска

Сіняўская Слабада цэнтр Сінявасласлабодскага сельсавета ў складзе вёскі: Антанёва, Новае Сяло, Рудзьма, хутар Чорная. Вёска Скорычы цэнтр Скорыцкага сельсавета ў складзе вёскі: Бауцічы, Даўгінава, Зарэчча. З 16.07.1954 года Ярэміцкі, Сіняваслабодскі і Скорыцкі сельсаветы аб`яднаны ў адзіны Ярэміцкі сельсавет Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці. З 17.12.1956 года вёска Ярэмічы - цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. З 25.12.1962 года вёска Ярэмічы цэнтр сельсавета Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, а з 06.01.1965 года вёска Ярэмічы зноў цэнтр сельсавета Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Старшыні сельсавета: Кісцень Д.Г., Мокат М.Дз., Каробка К.І., Сініца А.З., Бусько Л.С., Бусько А.А., Бусько А.І., Саўка Ул.Ул., Філіпаў П.П., Бразоўскі Г.С., Наумовіч П.А.

З 28.12.2007 года вёска Ярэмічы пераўтворана ў аграгарадок Ярэмічы Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

*Як утвараўся СВК "Ярэмічы"*

Утварэнне калгаса імя Царука. З 15.01.1949 года арганізаваны калгас "Светлы шлях", вёскі Зарэчча і Воўчае балота старшыня Янцэлевіч М.К., з 20.01.1949 года калгас "XI з'езд ВЛКСМ", вёска Баўцічы, старшыня Ракач М.Г., з 20.01.1949 года калгас "Ленінскі шлях", вёска Даўгінава года старшыня Царук М.Л., з 23.01.1949 года калгас "Барацьбіт", вёска Скорычы, старшыня Трубілка А.Л., з 20.01.1949 года калгас імя Жданава, вёска Вялікая Вобрына, старшыня Пучко А.І., з 22.07.1949 года калгас "Краіна Саветаў", вёска Малая Вобрына, старшыня Пучко А.С., з 05.10.1949 года калгас "Іскра", вёска Ярэмічы, старшыня Рап'явец А.Н. На 15.01.1952 года калгасы "Светлы шлях", "XI з'езд ВЛКСМ", "Ленінскі шлях", "Барацьбіт", імя Жданава, "Краіна Саветаў", "Іскра", аб`яднаны ў калгас імя Жданава - цэнтр вёска Вялікая Вобрына і далучана сялянская гаспадарка "Мір", вёскі Баўцічы старшыня Бычко С.А. З 07.02.1963 года калгас імя Жданава перайменаваны ў калгас імя Мічурына, вёска Вялікая Вобрына, старшыня Шасцель В.Ул. і аддзелена сялянская гаспадарка "Мір", вёска Баўцічы. З 07.03.1964 года

калгас імя Мічурына перайменаваны ў калгас імя Царука - цэнтр вёска Вялікая Вобрына. Старшыні: Шасцель В. Ул.(1963-1970гг.), з 25.10.1970 года Бар'яш В. В., з 05.03.1996 года Барычэўскі С. В. (1996-2009гг.).

*Утварэнне калгаса імя Чырвоных партызан.* З 23.09.1949 года арганізаваны калгас імя Молатава, вёска Новае Сяло, старшыня Бянецкі А. І., з 04.10.1949 года калгас "Камсамолец", вёска Лядкі старшыня Хома А. Л., з 06.10.1949 года калгас "Свабода", вёска Быковічы, старшыня Рап'явец А. Ц., з 12.10.1949 года калгас імя Маленкова, вёска Пагарэлка, старшыня Кеда П. Ф. (у 1940 годзе быў утвораны калгас імя Кірава канчаткова не арганізаваны), з 27.06.1950 года калгас "Чырвоны бераг", вёскі Сіняўская слабада і Антанёва, старшыня Наумовіч В. А. На 23.03.1951 года калгасы імя Молатава, "Камсамолец", "Свабода", імя Маленкова, "Чырвоны бераг", аб`яднаны ў калгас імя Молатава - цэнтр вёска Пагарэлка, старшыня Сініца А. З., з 25.12.1953 года старшыня Філіпаў П. П. З 09.02.1957 года калгас імя Молатава перайменаваны ў калгас імя Чырвоных партызан - цэнтр вёска Пагарэлка. Старшыні Філіпаў П. П., а з марта1973 Балабановіч Ул. Б. На 27.12.1977 года калгас імя Чырвоных партызан аб`яднаны з калгасам імя Царука - цэнтр вёска Вялікая Вобрына, старшыня Бар'яш В. В.

На 24.12.1975 года арганізаваны спецгас па авечкагадоўлі "Сіняўская слабада" - цэнтр вёска Сіняўская Слабада, старшыня Наумовіч Н. Ул. З 15.02.1988 года спецгас "Сіняўская Слабада" аб`яднаны з калгасам імя Царука - цэнтр вёска Вялікая Вобрына.

За дасягнутыя поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці 26.01.1977 года калгас імя Царука ўзнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны". З 1989 года - цэнтр калгаса імя Царука перанесены ў вёску Ярэмічы, старшыня Бар'яш В.В. (1970-1996гг.), а з 05.08.2003 калгас імя Царука перайменаваны ў СВК імя Царука, вёска Ярэмічы. Старшыні: Барычэўскі С.В. (1996-2009гг.), Сачко Р.М. .(2009-2014гг.), Такушэвіч В. В. з 2014г.

На 12.10.1940 года арганізавана Вобрынская МТС, вёска Першамайскі пасёлак, ў складзе калгаса імя Жданава. З 16.07.1954 года

Вобрынская МТС рэарганізавана, сельскагаспадарчая тэхніка размеркавана па калгасам.

Знакамітыя землякі: вёска Антанёва - навукоўца Ульянка Б. В., намескік мініства сельскай гаспадаркі Беларусі Клаўсуць А. Ф., вёска Баўцічы - літаратуразнаўца і крытык Наумовіч У. А., вёска Вялікая Вобрына - Герой Савецкага Саюза Царук У. З., Герой Сацыялістычнай працы Мокат А. М., вёска Даўгінава - беларускі пісьменнік Алесь Бажко, вёска Пагарэлка берарускі вучоны Мацко А. М., паэт Бусько М. І., вёска Сіняўская Слабада - беларускі пісьменнік Калеснік У. А., генерал-маёр Калеснік У. П., вёска Скорычы - беларускі паэт Алесь Мілюць, вёска Ярэмічы - пісьменнік Жук А. А., вучоны Лойка М. Ф.

ВЕТЭРАН ПРАЦЫ, КРАЯЗНАВЕЦ

Б.К. НАВІЦКІ

# ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

**Гміна вясковая** – тэрыторыя, якая не ўключае ў свой склад горада, найменшая адзінка адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу і мясцовага самакіравання на вёсцы пры Польшчы. Пасля далучэння тэрыторыі да Расіі была солтыствам.

**Мястэчка** - ўтваралася пры ўзвядзенні замкаў і пры гасцінцах. Пасля далучэння да Расійскай імперыі сталі цэнтрамі валасцей. У адрозненне ад вёсак яны вылучаліся гандлем і рамяством, як асноўнымі заняткамі большай часці жыхароў, мелі большую складанасць планавання, забудовы і абавязкова гандлёвы пляц. У канцы 1930 года тэрмін "мястэчка" перастаў існаваць юрыдычна і яны перайшлі ў разрад вёсак.

**Аграгарадок** - адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, добраўпарадкаваны населены пункт у сельскай мясцовасці, у якім створана вытворчая і сацыяльная інфраструктура для забеспячэння сацыяльных стандартаў насельніцтва.

**Вёска** - паселішча з некалькамі дзесяткамі альбо сотнямі хат індывідуальнага збудавання, з цягам часу можа быць пераўтворана ў сяло. Асноўнае адрозьненне ў тым, што ў сяле павінна быць царква, аднак гэта не з`яўлялася агульным правілам. Узніклі ў XVI стагоддзі пасля рэформы і ўстановы адзінкі феадальнай павіннасці "валока" замест ранейшых двара ці некалькі двароў.

**Сяло** - тып буйнага сельскага пасялення, часцей за ўсё цэнтр воласці дзе мелася царква, або касцёл, а пазней і абавязкова наяўнасць абшарніцкага маёнтку. Узніклі ў XVI - XVII стагоддзях ў сувязі з запрыгоньваннем сельскай абшчыны. Пасля далучэння да Расійскай імперыі, сёлы, як правіла, становяцца цэнтрамі валасцей у складзе паветаў. У XIX стагоддзі абавязковым атрыбутам сяла сталі царква, або касцёл, вучэльня і валасное праўленне, а ў XX стагоддзі сёлы сталі цэнтрамі сельсаветаў, калгасаў і саўгасаў і атрымалі статус вёскі.

**Фальварак** - невялікае паселішча ў адзін ці пяць двароў, адмысловая феадальная гаспадарка, спецыялізаваная выключна на вытворчасць збожжа на продаж. Паводле характару і структуры забудовы фальварка адпавядалі абшарніцкім маёнткам, ці заможным шляхецкім засценкам. Фальваркам часам называлі вёску на зямлі арандатара. Узніклі ў канцы XV і на пачатку XVI стагоддзяў і праіснавалі на цяперашняй тэрыторыі раёна да канца 30-х гадоў XX стагоддзя.

**Засценак** - невялікае сялянскае аднадворнае пасяленне, аналагічнае заможнаму дворышчу. Узніклі пасля рэформы 1557 года, вядомай як “устава на валокі”. Пасля перамеру зямлі, засталіся адзінкі зямлі “за мяжою” ці “за сцяною”, якія знаходзіліся ў канцы поля і перадаваліся дробнай шляхце. Узніклі ў XVI - XX стагоддзях і праіснавалі да 1940 года.

**Ляснічоўка** - хата лясніка і яго сям'і ў лесе, ці каля яго.

**Асада і Асада млыновая** - на землі адабраныя ў сялян у перыяд польскай акупацыі сялілі каланістаў-асаднікаў і іх паселішчы называлі асадай.

**Аколіца** - паселішча дробнай шляхты, якая ссялялася асобна ад сялян-вяскоўцаў.

**Калонія** - участак паміж польскімі дамамі заняты пазнейшымі пабудовамі.

**Выкарыстаная літаратура:**


1. Архівы установ, арганізацый, прадпрыемстваў і гаспадарак.
2. Беларуская савецкая энцыклапедыя. П. Броўкі. — БелСЭ., 1981.
3. Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. Т.1. Абаленскі-Кадэнцыя / рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.] — Мн. : Бел.Эн., 2007. — 688 с.
4. Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. Т.1. Кадэцкі корпус-Яцкевіч / рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.] — Мн. : Бел.Эн., 2007. — 792 с.
5. Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. : Т.3. Дадатак / рэдкал. : Т.У. Бялова [і інш.] — Мн. : Бел.Эн., 2010. — 696 с.
6. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т.1. Старажытная Беларусь : ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал. : М.Касцюк [і інш.]. –Мінск : Экаперспектыва, 2007. — 351с.
7. Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т.2. Беларусь у перыяд ВКЛ / рэдкал. : М.Касцюк [і інш.]. –Мінск : Экаперспектыва, 2008. — 688с.
8. Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т.3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII – XVIII стст.) / рэдкал. : М. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2007. — 344с.
9. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т.4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / рэдкал.: М.Касцюк [і інш.]. –Мінск : Экаперспектыва, 2005. — 519с.
10. Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т.5. Беларусь у 1917-1945 гг. / рэдкал. : М.Касцюк [і інш.]. –Мінск : Экаперспектыва, 2006. — 613с.
11. Елізараў, С.А. Фарміраванне і функцыянаванне сістэмы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення БССР (1919-1991 гг.) / С. А. Елізараў. — Гомель : ГДТУ ім. П. А. Сухога, 2009.
12. Зборнік законаў Беларускай ССР і Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР 1938-1955 гг. — Мінск : Весткі Саветаў дэпутатаў працоўных БССР, 1956.
13. Зборнік Законаў Беларускай ССР : у 10 т. / Прэзідыум ВС БССР, Савет Міністраў БССР. — Мінск.: Беларусь, 1984.

14. Зборнік законаў СССР і Указаў Прэзідыума ВС СССР 1938-1975: у 4 т. / редкал.: Ул. І. Васільеў [і інш.]. — Масква: Весткі Саветаў дэпутатаў працоўных СССР, 1975.

15. Круталевіч, В. А. Рэспубліка Беларусь: адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне / В.А.Круталевіч. — Мінск : "Навука і тэхніка", 1966.

16. Маргунскі, С.П. Дзяржаўнае будаўніцтва Беларускай ССР на першым этапе яго развіцця / С.П. Маргунскі. — Мінск : Акадэмія Навук БССР, 1953.

17. Матэрыялы раянавання Заходніх абласцей Беларускай ССР. ЦК КП(б)Б. — Мінск. : Выдавецтва ЦК КП(б)Б, 1940.

18. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т.1. А-Беліца / рэдкал. : М.В. Біч [і інш.]; прадм. М.Ткачова; маст. Э.Э.Жакевіч. — Мн. : Бел.Эн., 1993. — 494 с. : іл.

19. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т.2. Беліцк-Гімн / рэдкал. : Б.І. Сачанка [і інш.]; маст. Э.Э.Жакевіч. — Мн. : Бел.Эн., 1994. — 537 с. : іл.

20. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т.3. Гімназіі-Кадэнцыя / рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.]; маст. Э.Э.Жакевіч — Мн. : Бел.Эн., 1996. — 527 с. : іл.

21. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т.4. Кадэты-Ляшчэня / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]; маст. Э.Э.Жакевіч. — Мн. : Бел.Эн., 1997. — 432 с. : іл.

22. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т.5. М-Пуд / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]; маст. Э.Э.Жакевіч. — Мн. : Бел.Эн., 1999. — 592 с. : іл.

23. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т.6. Пузелі-Усая / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]; маст. Э.Э.Жакевіч. — Мн. : Бел.Эн., 2001. — 591 с. : іл.